ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

СЕРАДА, 15 ЛЮТАГА 1939 г. № 9 (423)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

НАСУСТРАЧ XVIII З'ЕЗДУ ВКП(б)

На 10 сакавіка 1939 года прызначана адкрыццё XVIII з'езда Усесаюзнай Камуністычнай партыі (большэвікоў). На з'ездзе выступіць са справаздачным дакладам правадыр працоўнага чалавецтва вялікі Сталін. У друку апублікаваны тэзісы даклада таварыша Молатава «Аб трэцім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР» і тэзісы даклада таварыша Жданава «Аб зменах у статуце ВКП(б)».

З радасцю і гордасцю за сваю квітнеючую соцыялістычную радзіму савецкі народ сустракае XVIII з'езд ВКП(б). Наша радзіма пабеданосна ідзе да ззяючых вяршынь комунізма.

Кожны працоўны Саюза ССР чытае і вывучае тэзісы даклада таварыша В. Молатава. Гэты дакумент чотка і ясна адлюстроўвае тыя перамогі, якія здабылі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і яе ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта народы Саюза ССР за перыяд ад XVII да XVIII з'езда ВКП(б), і намячае грандыёзную праграму гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў трэцюю сталінскую пяцігодку.

З вялікім уздымам абмяркоўваюцца ўсімі партыйнымі арганізацыямі тэзісы даклада таварыша Жданава на XVIII з'ездзе ВКП(б), прасякнутыя сталінскімі клопатамі аб арганізацыйнай магутнасці нашай партыі.

Папярэдні, XVII з'езд партыі большэвікоў увайшоў у гісторыю як «з'езд пераможцаў». У палітычнай справаздачы ЦК ВКП(б) XVII з'езду таварыш Сталін гаварыў: «... мы пабудавалі ўжо фундамент соцыялістычнага грамадства ў СССР і нам застаецца толькі ўвянчаць яго надстройкамі...»

У рэзультаце паспяховага выканання другой сталінскай пяцігодкі вырашана асноўная гістарычная задача нашай радзімы — у СССР знішчаны ўсе формы эксплаатацыі разам з іх носьбітамі — эксплаатататарскімі класамі, ліквідаваны поўнасцю прычыны, якія параджаюць эксплаатацыю чалавека чалавекам. У нашай краіне назаўсёды пакончана з падзяленнем грамадства на эксплаататараў і эксплаатыруемых.

Найцяжэйшая задача соцыялістычнай рэволюцыі — соцыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі — вырашана: у вёсцы канчаткова перамог калгасны лад. Соцыялістычная сістэма вытворчасці безраздзельна пануе ва ўсёй народнай гаспадарцы СССР. Гэтаму адпавядае класавая структура савецкага грамадства, якое састаіць цяпер з двух дружаственых класаў — рабочых і сялян. Грані паміж гэтымі класамі, а таксама паміж імі і інтэлігенцыяй паступова знікаюць.

Усё гэта паказвае, што ў СССР «ажыццёўлена ў асноўным першая фаза комунізма — соцыялізм» (Сталін). Соцыялізм моцна і непахісна ўвайшоў у быт.

Змены, якія адбыліся ў рэзультаце перамогі соцыялізма ў нашай краіне, выклікаюць неабходнасць змяніць і ўмовы прыёму ў партыю. Зараз няма патрэбы ва ўстанаўленні розных катэгорый пры прыёме ў партыю ў залежнасці ад соцыяльнага становішча. Умовы прыёму ў ВКП(б) рабочых, сялян, інтэлігенцыі будуць аднолькавымі.

Перамога соцыялізма ў СССР забяспечыла нябачанае раней у свеце маральна-палітычнае адзінства савецкага народа, адзінства і згуртаванасць усіх працоўных вакол сваёй комуністычнай партыі і Савецкай улады. Яна наглядна дэманстрыруе выключную жыццёвую сілу марксізма-ленінізма.

Перамогі двух сталінскіх пяцігодак атрыманы краінай пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна, яе ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта. Гэтыя перамогі атрыманы ў бязлітаснай барацьбе з астаткамі варожых класавых элементаў, з агентамі фашысцкіх разведак. Савецкі народ знішчыў трацкісцка-бухарынскіх і буржуазна-нацыяналістычных шпіёнаў, дыверсантаў і шкоднікаў і выкарчоўвае іх паследышаў. Да канца ліквідаваць вынікі шкодніцтва, узняць большэвіцкую пільнасць ва ўсёй рабоце — абавязковая ўмова новых перамог у трэцяй пяцігодцы.

Савецкі Саюз уступае ў трэцяй пяцігодцы ў паласу завяршэння бяскласавага соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу ад соцыялізма к комунізму.

«Цяпер, — сказана у тэзісах даклада таварыша Молатава,—калі СССР склаўся як соцыялістычная дзяржава, закончыў у асноўным тэхнічную рэканструкцыю народнай гаспадаркі і па ўзроўню тэхнікі вытворчасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы стаіць уперадзе любой капіталістычнай краіны Еўропы, — цяпер мы можам і павінны на ўвесь рост практычна паставіць і ажыццявіць вырашэнне асноўнай эканамічнай задачы СССР: **дагнаць і перагнаць таксама ў эканамічных адносінах найбольш развітыя капіталістычныя краіны Еўропы і Злучаныя Штаты Амерыкі**, канчаткова вырашыць гэту задачу на працягу бліжэйшага часу».

Самым галоўным і самым важным для дасягнення гэтай мэты з'яўляецца высокая соцыялістычная прадукцыйнасць працы, большэвіцкая дысцыпліна і арганізаванасць.

XVIII з'езд ВКП(б) адкрываецца ў перыяд, калі кастры вайны, палаючыя ў Іспаніі і Кітаі, пагражаюць ператварыцца ў нябачаныя пажарышчы. Фашысцкія падпальшчыкі вайны імкнуцца перашкодзіць мірнай працы савецкага народа. Наш народ, кіруемы партыяй Леніна—Сталіна, бязлітасна громіць агентуру фашызма, засылаемую ў нашы тылы, і ён разгроміць любога ворага, калі той паспрабуе рушыць на нашу свяшчэнную зямлю.

Працуючы на мяжы з фашысцкімі дзяржавамі, мы, работнікі літаратуры і мастацтва Савецкай Беларусі, як і ўсе працоўныя, ніколі не забываем слоў вялікага Сталіна аб наяўнасці капіталістычнага акружэння. Мы абавязаны няспынна павышаць палітычную пільнасць, узмацняць мабілізацыйную гатоўнасць, ствараць мастацкія творы, якія будуць дапамагаць народу ў барацьбе з усімі ворагамі комунізма.

У сувязі з велізарнымі задачамі, якія пастаўлены трэцяй сталінскай пяцігодкай, гіганцка вырастае роля і значэнне савецкай інтэлігенцыі, роля і значэнне культурных сіл соцыялізма.

«У сучасных умовах, калі ў СССР безраздзельна пануе соцыялістычная форма гаспадаркі, соцыялістычная ўласнасць, соцыялістычная арганізацыя працы, калі рашаючае значэнне для поспехаў нашай справы набывае комуністычная свядомасць у рабоце на карысць нашай дзяржавы, народа і ўсіх працоўных, — гіганцка ўзнімаецца роля савецкай інтэлігенцыі, умеючай па-большэвіцку працаваць, пабольшэвіцку весці барацьбу за ўздым культурнасці і комуністычнай свядомасці працоўных. Цяпер, пасля канчатковага ўмацавання палітычных і эканамічных пазіцый соцыялістычнага грамадства ў СССР, вырашаюць справу кадры, засвоіўшыя тэхніку вытворчасці, вырашаюць справу савецкія культурныя сілы, узначальваючыя масы працоўных у іх вялікай барацьбе за поўную перамогу комунізма». (З тэзісаў даклада тав. Молатава).

Пісьменнікі і работнікі мастацтваў павінны стаць у першую шарэнгу барацьбітоў за комуністычнае выхаванне працоўных. Прадаўжаючы традыцыі геніяльных рускіх пісьменнікаў—Пушкіна, Гогаля, Лермантава, Салтыкова-Шчэдрына, Талстога, Горкага, Маякоўскага, пісьменнікі павінны стварыць класічныя вобразы людзей нашага часу.

Работнікі навукі, літаратуры і мастацтваў, як і ўсе працоўныя, разгарнулі большэвіцкую падрыхтоўку да XVIII з'езда партыі Леніна—Сталіна. Тэзісы дакладаў таварышоў Молатава і Жданава выклікалі вялікую актыўнасць у працоўных нашай бацькаўшчыны, творчы ўздым і жаданне яшчэ лепш працаваць на карысць комунізма. Работнікі Дзяржаўнага Беларускага тэатра оперы і балета абавязаліся ў 1939 годзе паставіць дзве беларускія оперы і балет. Мастакі Беларусі абавязаліся датэрмінова зрабіць высокаякасныя эскізы карцін для выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Усе мастакі абавязаліся актыўна працаваць над афармленнем павільёна БССР на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы 1939 года.

Дзякуючы ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы і ўсямернай дапамозе, увазе і клопатам большэвіцкай партыі і асабіста таварыша Сталіна—культура беларускага народа выйшла ў першую шарэнгу культур братніх народаў вялікага Савецкага Саюза. Дасягненні беларускага народа на фронце літаратуры адзначаны Саюзным урадам, — лепшыя беларускія пісьменнікі ўзнагароджаны ордэнамі Саюза ССР.

У гэтым акце ўзнагароджання выразілася велізарная ўвага партыі і ўрада да мастацкага слова, высокая ацэнка той работы, якую ажыццяўляюць літаратары. Гэта вялікае давер'е, аказанае нам партыяй і ўрадам, мы павінны апраўдаць на справе. Патрабаванні да работніка мастацкага слова вырастаюць з кожным днём разам з ростам палітычнай свядомасці і культурнасці народных мас. Задача далейшага ўздыму нашай літаратуры становіцца асабліва важнай зараз, калі мы завяршаем будаўніцтва соцыялістычнага грамадства і ажыццяўляем паступовы пераход да комунізма.

Доўг савецкіх пісьменнікаў і работнікаў мастацтваў — пісаць так, каб кожнае іх слова, кожная іх мысль у новых мастацкіх творах служыла велізарнейшай у гісторыі справе пабудовы комуністычнага грамадства.

ЭДУАРД ЛЮДВІГАВІЧ САМУЙЛЕНАК



УРАДАВАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

Совет Народных Камісараў БССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці таленавітага беларускага пісьменніка-ордэнаносца **Эдуарда Людвігавіча САМУЙЛЁНКА**, паследваўшай пасля цяжкай хваробы 12 лютага г. г.

* * *

Совет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б выражаюць сям'і Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка сваё глыбокае спачуванне ў сувязі са смерцю таленавітага пісьменніка-ордэнаносца таварыша **Самуйлёнка**.

СНК БССР і ЦК КП(б)Б.

* * *

Прэзідыум Вярхоўнага Совета БССР выносіць спачуванне сям'і, родным і знаёмым па поваду пасцігшага гора — бясчаснай смерці аднаго з таленавіцейшых пісьменнікаў ордэнаносца Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка.

ПРЭЗІДЫУМ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР.

* * *

Праўленне, партыйная арганізацыя і мясцком Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР з глыбокім жалем паведамляюць, што 12 лютага г. г. пасля працяглай і цяжкай хваробы памёр таленавіты беларускі пісьменнік - ордэнаносец Эдуард Людвігавіч Самуйлёнак.

Беларуская літаратура панесла цяжкую ўтрату. Эдуард Людвігавіч Самуйлёнак быў адным з самых адароных, самых смелых, самых любімых народам майстраў мастацкага слова. Гарачы і страсны патрыёт, верны сын сваёй радзімы, Эдуард Самуйлёнак кожным радком сваіх твораў служыў вялікай справе комунізма, быў жывым прыкладам для ўсёй беларускай савецкай інтэлігенцыі.

Беларускі народ ніколі не забудзе свайго выдатнага пісьменніка. Вобраз Эдуарда Самуйлёнка застанецца ў памяці ўсіх працоўных нашай рэспублікі.

ПРАЎЛЕННЕ, ПАРТКОМ І МЯСЦКОМ САЮЗА САВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

* * *

Праўленне Саюза савецкіх пісьменнікаў СССР выказвае свой глыбокі смутак аб утраце таленавітага маладога пісьменніка Беларусі ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка. Перажываючы гэту ўтрату, разам з вамі будзем імкнуцца да таго, каб творы таварыша Самуйлёнка сталі шырока вядомымі чытачам савецкіх рэспублік.

Масква.

Член прэзідыума Н. АСЕЕЎ.

* * *

Дырэкцыя, партком і мясцком Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі смуткуюць з прычыны заўчаснай смерці таленавіцейшага беларускага пісьменніка-ордэнаносца САМУЙЛЁНКА, ЭДУАРДА ЛЮДВІГАВІЧА, і выказваюць глыбокае спачуванне Саюзу Савецкіх пісьменнікаў БССР і сям'і памёршага.

* * *

Менскі абласны аддзел мастацтваў глыбока смуткуе з прычыны заўчаснай смерці таленавітага пісьменніка-драматурга Эдуарда Людвігавіча САМУЙЛЁНКА і выказвае спачуванне сям'і нябожчыка.

ЯНКА КУПАЛА

ПАМЯЦІ ЭДУАРДА САМУЙЛЁНКА

Дружа мой, сокале ясны, крылаты,
Крыллі навекі апалі твае, —
Ты ўжо не прыдзеш на нашыя святы,
Голас твой песень для нас не спяе.

Слёзамі дожджык пальецца на грудзі,
Насып-магілку абсыпле расой, —
Слёзы высушываць сонейка будзе,
Сонейка будзе заўсёды з табой.
Восенню кветкі завянуць у полі, —
Кветцы, засохшай, ізноў не цвісці, —
Думкі твае не завянуць ніколі —
Думкі аб нашым прыгожым жыцці.

Менск,
12 лютага 1939 г.

ЦЯЖКАЯ ЎТРАТА

Пачуццё горычы і болю выклікае бясчасная смерць аднаго з таленавіцейшых беларускіх пісьменнікаў. Не стала Эдуарда Самуйлёнка. Калі ўспамінаеш яго, якім ён быў яшчэ два годы таму назад — крэпкі, тэмпераментны, вясёлы і жыццерадасны, то трудна паверыць і пагадзіцца з думкай, што бязлітасная і недарэчная смерць скасіла гэтага чалавека.

У асобе Самуйлёнка беларуская мастацкая літаратура панесла цяжкую ўтрату, а беларускія пісьменнікі і паэты востра адчулі боль вечнай разлукі з дасканалым чалавекам-грамадзянінам, з добрым і верным таварышам і адданым другам. Не доўгім быў жыццёвы шлях Эдуарда Самуйлёнка. Ён толькі ступаў на парог свайго пісьменніцкага поўдзеня. Яго выключнае дараванне, дараванне шырокага мастацкага дыяпазона не паспела развінуцца ва ўсю сваю красу і сілу. Гэта быў пісьменнік з ярка акрэсленым, сугуба сваім мастацкім голасам. Савецкі народ, яго ўрад і наша родная партыя большэвікоў далі высокую ацэнку яго пісьменніцкай дзейнасці, узнагародзілі яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Вечная памяць табе, дарагі пісьменнік і таварыш.

Твая спадчына, як драгацэнны самародак, увойдзе ў залаты фонд савецкай мастацкай літаратуры.

ЯКУБ КОЛАС.

БЫВАЙ, ДАРАГІ ТАВАРЫШ!

Памёр Эдуард Людвігавіч Самуйлёнак.

Няўмольная смерць вырвала з нашых радоў таленавіцейшага пісьменніка і драматурга, майстра мастацкага слова, вернага савецкага патрыёта, гуманіста, крышталына чыстага чалавека, чулага таварыша.

Яшчэ зусім нядаўна Эдуард Людвігавіч чытаў нам сваю цудоўную п'есу «Пагібель воўка» і спадзяваўся ўбачыць сваё дзецішча на сцэне; яшчэ зусім нядаўна збіраўся ён паехаць у квітнеючую Савецкую Грузію, у савецкую Калхіду, каб сабраць там матэрыялы і дапісаць другую частку рамана «Будучыня»; яшчэ зусім нядаўна, стоячы ўжо адной нагой у магіле, у адказ на віншаванне з узнагароджаннем яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ён выказваў свае мары, раскрываў планы сваёй творчай працы.

Крылатыя мары! Іх не здзейсніў поўнасцю Эдуард Людвігавіч. Цудоўнае жыццё яго, поўнае энергіі і прагнасці тварыць на карысць і славу любімай савецкай радзімы, так рана і трагічна абарвалася, абарвалася ў самым росквіце творчых сіл.

Сын петраградскага рабочага, сын свайго народа, сваёй радзімы, Эдуард Людвігавіч да канца дзён сваіх служыў вялікай справе комунізма, прапагандыраваў ідэі большэвізма, быў мужным і смелым мастаком.

Шмат энергіі і сілы прыклаў ён к таму, каб несці выхаваўчую сілу мастацкага слова ў народныя масы. Яшчэ ў маленстве цягнула Эдуарда да кніг, да граматы, але сыну рабочага да рэволюцыі вучыцца было немагчыма. На апошнія грошы, недаядаючы, купляў ён кнігі і з гэтых кніг чэрпаў сваю агульную адукацыю. Рабочае асяроддзе, якое выхавала яго, паказала яму шлях, па якому трэба ісці. І ён ішоў па ім горда і смела. Гэты шлях быў цяжкім, але ні разу нага пісьменніка не пакаўзнулася, ні разу не паскардзіўся ён на цяжкасць шляху, ні разу не заявіў аб стомленасці.

Імкнучыся да творчых вышынь, да паказу новага савецкага чалавека, да мастацкага адлюстравання гераічнай барацьбы вялікага савецкага народа супроць сваіх знешніх і ўнутраных ворагаў, Эдуард Людвігавіч кісцю таленавітага майстра мастацкага слова здолеў у яркіх фарбах выказаць глыбокую непрымірымую нянавісць савецкага народа да сваіх ворагаў, вялікую і бязмежную любоў народа да сваёй квітнеючай соцыялістычнай радзімы.

Эдуарда Людвігавіча любіць увесь савецкі народ, любіць за яго вялікі патрыятызм, за яго праўдзівасць і гуманнасць, за рэалізм і высокую мастацкасць яго хвалюючых твораў. З вялікай любоўю і павагай віншавалі яго савецкія людзі з высокай узнагародай — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, шчыра жадалі яму хутчэйшага выздараўлення, плённай працы. З вялікай радасцю прымаў увагу і любоў народа цяжка хворы пісьменнік. Незгасальным агнём гарэла ў яго сэрцы прагнасць працы на карысць сваёй радзімы. Але раптам халоднае дыханне пагасіла гэты агонь—Эдуард Людвігавіч ляжыць у грубе безжыццёвы і халодны.

Бывай, дарагі таварыш! — гавораць твае сябры па пяру. Ты быў для нас узорам адданага савецкага грамадзяніна, твая творчасць вучыла і будзе вучыць нас вялікім чалавечым пачуццям — гуманізму, праўдзе, любві і нянавісці.

Бывай, дарагі таварыш! — гавораць табе, свайму любімаму пісьменніку, твае чытачы — інтэлігенты, рабочыя, калгаснікі, вучні. Не раз яшчэ прачытаюць яны твае творы, будуць захапляцца імі і ўспамінаць аб табе.

Тысячы людзей прышлі к табе развітацца, тысячы людзей жадалі-б, каб ты быў жывым, тысячы людзей, адпраўляючы гроб твой у апошні шлях—к магіле, усlаўляюць тваё кароткае, але выдатнае жыццё.

Бывай, дарагі таварыш!

ПАДЗЯЛЯЕМ СМУТАК

Студэнты і выкладчыкі Вышэйшай комуністычнай сельскагаспадарчай школы Беларусі імя Леніна падзяляюць смутак працоўных з прычыны заўчаснай смерці таленавітага пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда САМУЙЛЁНКА.

Дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР:

І. Т. Значонак, С. П. Рачок, А. І. Мацюшэнка, С. П. Макарэнка.

Дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР:

С. Ю. Міклашэўская, А. А. Руткоўскі, А. У. Краўчанка, К. М. Кунцэвіч, В. С. Ясачонак, А. І. Пальцава, І. М. Рыбак, С. Я. Музыка, Ю. П. Малянок, М. Ф. Пыж, О. К. Шарко, К. Н. Ястрэмскі, Е. Я. Кульба.

Ордэнаносцы:

І. А. Клімянкоў, Д. Д. Парахонька, Р. В. Мутакоў, З. М. Шынгароў.

Навуковыя работнікі:

В. А. Міронаў, Ф. Н. Лазоўскі.

* * *

Студэнты і выкладчыкі Комуністычнага інстытута журналістыкі БССР імя С. М. Кірава выказваюць глыбокае спачуванне Саюзу савецкіх пісьменнікаў БССР і сям'і Э. Л. Самуйлёнка з прычыны заўчаснай смерці выдатнага беларускага пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда САМУЙЛЁНКА.

* * *

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці таленавітага беларускага драматурга, пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Людвігавіча САМУЙЛЁНКА і выказвае спачуванне сям'і нябожчыка.

* * *

Праўленне Саюза савецкіх мастакоў БССР выказвае свой глыбокі жаль з поваду заўчаснай смерці пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка і перадае сваё шчырае спачуванне сям'і нябожчыка.

* * *

Смуткуем разам з вамі з прычыны заўчаснай смерці маладога таленавітага пісьменніка-ордэнаносца Самуйлёнка. Перадайце наша спачуванне сям'і нябожчыка.

Дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры СССР. ЛАЗОЎСКІ.

* * *

Пісьменніцкая грамадскасць Татарыі выказвае глыбокае спачуванне пісьменнікам Савецкай Беларусі з прычыны заўчаснай утраты таленавітага пісьменніка беларускага народа ордэнаносца Самуйлёнка. Вялікую ўтрату савецкай літаратуры запоўнім новымі высокамастацкімі творамі, вылучэннем новых кадраў літаратуры.

ВАХІТАЎ.

Старшыня праўлення ССП Татарыі.

Казань.

* * *

Вобраз яго назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах

Гора сціснула нашы сэрцы, калі мы даведаліся аб заўчаснай смерці аднаго з лепшых пісьменнікаў Беларусі ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка. Смерць вырвала яго з нашых радоў у момант самага росквіту яго творчых сіл. Яго смерць — вялікая ўтрата для ўсёй савецкай літаратуры.

Таленавітыя творы Эд. Самуйлёнка доўга будуць жыць і выхоўваць нашага чытача ў духу любві і адданасці справе Леніна—Сталіна.

Мы добра ведалі тав. Самуйлёнка не толькі як выдатнага пісьменніка, але і як чулага, добрага таварыша; яго вобраз назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Спі спакойна, наш любы Эдуард. Кампазітары Беларусі шлюць табе апошняе бывай!

САЮЗ САВЕЦКІХ КАМПАЗІТАРАЎ БССР.

АБ ПАХАВАННІ ПІСЬМЕННІКА-ОРДЭНАНОСЦА Э. Л. САМУЙЛЁНКА

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР.

Совет Народных Камісараў БССР **пастанавіў:**

1. Арганізаваць камісію па пахаванню тав. Самуйлёнка Эдуарда Людвігавіча ў саставе сакратара Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Папкова (старшыня), Янкі Купалы, Якуба Коласа, Эйдзінава Г. Б., Клімковіча, Лебедзева, Вінаградава, Алер, Герчыкава.

2. Пахаванне тав. Самуйлёнка прыняць на кошт урада БССР.

3. Назначыць персанальную пенсію сям'і тав. Самуйлёнка.

ЭДУАРД ЛЮДВІГАВІЧ САМУЙЛЁНАК

БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС

Эдуард Людвігавіч Самуйлёнак нарадзіўся ў 1907 годзе 23 ліпеня ў Пецербургу ў сям'і чорнарабочага. Бацька яго паходзіў з вёскі Бандзелі, цяпер Дрысенскага раёна. Сям'я жыла вельмі бедна і бацька вымушан быў шукаць сродкаў на пражыццё ў горадзе. Спачатку ён працаваў чорнарабочым, разносчыкам газет, потым некаторы час наборшчыкам у друкарні.

Дзіцячыя годы Эдуард правёў у горадзе. Заработак бацькі быў мізэрны і сям'я жыла бедна. Маленькім хлапчуком Эдуард павінен быў дапамагаць бацьку. Магчымасці вучыцца не было і яму ўдалося скончыць толькі 3 класы пачатковай школы. Жывучы ў горадзе, бацька, аднак, не парываў сувязі з вёскай, дзе жылі сваякі.

У вёску Бандзелі сям'я вярнулася пасля Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Але на маленькай аднаасобнай гаспадарцы пражыць было цяжка. Бацька з Эдуардам хадзілі на пабочныя заработкі — пільшчыкамі, лесарубамі. З малых год Эдуард перанёс увесь цяжар непасільнай работы.

Вельмі рана ў Эдуарда праявілася цяга да кніг. Не маючы магчымасці прадаўжаць адукацыю ў школе, ён папаўняў свае веды чытаннем. Позвімі вечарамі, прыходзячы з работы, ён перачытваў усё, што мог дастаць у настаўніка альбо ў суседзяў. Не раз маці, бачачы, як стомлены дзённай работай Эдуард сядзіць уначы над кнігай, звярталася да яго з просьбай: «Адпачыў-бы, сынок».

У 1924 годзе ў суседнім з вёскай Бандзелі мястэчку Росіцы арганізавалася комсамольская ячэйка. Эдуард быў адным з яе арганізатараў. Ён прымаў самы актыўны ўдзел у той вялікай рабоце, якую праводзіў комсамол на вёсцы, — арганізоўваў сходы і вечары моладзі, самадзейныя гурткі пры хаце-чытальні. Умовы пагранічча ўскладалі асаблівую адказнасць на комсамольскую арганізацыю. Эдуард і яго таварышы-комсамольцы аказвалі вялікую дапамогу пагранічнікам у барацьбе з контрабандыстамі і шпіёнамі.

Багатыя ўражанні пагранічнага жыцця, класавая барацьба на вёсцы, работа вясковага комсамола далі яму невычарпальны матэрыял для будучай літаратурнай работы. К гэтаму-ж перыяду адносяцца і яго першыя літаратурныя спробы.

У канцы 1928 года ў полацкай акруговай газеце «Чырвоная Полаччына» былі надрукаваны невялікая паэма Эдуарда пра партызана і некалькі вершаў. Праз год Эдуард быў прызван у рады Чырвонай Арміі. Будучы ў Чырвонай Арміі, ён не спыняе сваёй літаратурнай работы. Захапленне творамі Максіма Горкага штурхае Эдуарда паспрабаваць свае здольнасці ў прозе. Ён піша некалькі апавяданняў з жыцця Чырвонай Арміі і друкуе іх на старонках «Чырвонаармейскай праўды» і «Чырвонай Полаччыны».

Вярнуўшыся з Чырвонай Арміі ўвосені 1930 года, Эдуард паступіў на работу ў рэдакцыю полацкай акруговай газеты, у якой і працаваў да 1934 года. Увесь час ён упарта і шмат працуе над сабой і над літаратурнымі творамі. Да гэтага часу адносяцца яго больш буйныя творы: аповесць «Насустрач будучыні», апавяданні «Цагліна казэмата», «Русальчыны сцежкі» і выдатная аповесць «Тэорыя Каленбрун». Апрача таго, ён распрацоўвае планы сваіх будучых твораў, у тым ліку трылогіі «Пажар павуціння», першую частку якой ён напісаў у чарнавым выглядзе.

У 1934 годзе Эдуард пераязджае ў Менск, каб поўнасцю аддацца літаратурнай дзейнасці. Тут ён піша рад новых апавяданняў, якія выпушчаны ў свет Дзяржаўным выдавецтвам БССР у 1935 годзе зборнікам «Пункт апоры». У гэтым-жа годзе ён разам з групай совецкіх беларускіх пісьменнікаў едзе ў Грузію для абмену творчым вопытам з грузінскімі пісьменнікамі. Гэта паездка дала яму багаты матэрыял для рамана «Будучыня». Працуючы над раманам, ён адначасова піша п'есу «Сержант Дроб» і выдае зборнік новых апавяданняў «Дачка эскадрона».

Увесь гэты час ён актыўна ўдзельнічае ў рабоце пісьменніцкай арганізацыі, вядзе рашучую барацьбу за ачышчэнне радоў пісьменнікаў ад ворагаў народа.

Не гледзячы на цяжкую хваробу, якая няшчадна падтачвала яго сілы, ён не спыняў сваёй літаратурнай і грамадска-палітычнай дзейнасці. Закончыўшы першую кнігу рамана «Будучыня», ён, будучы ўжо хворым, напісаў п'есу «Пагібель воўка», якая атрымала высокую ацэнку совецкай грамадскасці. Разам з тым ён задумляў і распрацоўваў новыя творчыя планы.

Совецкі ўрад высока ацаніў работу Эдуарда Людвігавіча і 31 студзеня 1939 года ўзнагародзіў яго ў ліку лепшых пісьменнікаў Совецкага Саюза ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Радасная вестка аб узнагародзе застала яго прыкаваным да пасцелі.

«Выказваю сваю радасць і ўдзячнасць, — пісаў Эдуард Людвігавіч, даведаўшыся пра гэта, — за высокую ўзнагароду, якой удастоілі мяне партыя і ўрад.

Гэта высокая ацэнка маёй работы. У дні падрыхтоўкі да гістарычнага XVIII з'езда нашай любімай комуністычнай партыі, калі совецкая краіна падводзіць вынікі вялікіх перамог соцыялізма я аддам усе свае сілы і здольнасці пісьменніка на карысць маёй горача любімай радзімы».

Няўмольная смерць абарвала прыгожае і поўнае творчай энергіі жыццё Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка. 12 лютага 1939 года ў 13 гадзін 35 мінут Эдуарда Людвігавіча не стала.

СПАЧУВАННІ БРАТНІХ ЛІТАРАТУР

Саюз совецкіх пісьменнікаў Грузіі выказвае глыбокае спачуванне з прычыны смерці таленавітага беларускага пісьменніка Эдуарда Самуйлёнка. У яго асобе беларуская літаратура і ўся совецкая літаратура страціла аднаго з выдатных мастакоў слова, поўнага творчых сіл і энергіі. Яго раман з жыцця грузінскага народа застанецца бліскучым дакументам сталінскай дружбы народаў.

Тбілісі. **САНДРО ЭУЛІ.**

* * *

Пісьменнікі Узбекістана глыбока смуткуюць аб смерці пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка.

САЮЗ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАУ УЗБЕКІСТАНА.

Ташкент.

* * *

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў Украіны выказвае сваё спачуванне з прычыны заўчаснай смерці таленавітага беларускага пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка.

БАЖАН, ГАЛОУКА, ГАРАДСКОЙ, КАПЫЛЕНКА, КАРНЕЙЧУК, ІВАН ЛЕ, МАЛЫШКА, ПАНЧ, РЫБАК, РЫЛЬСКІ, ТЫЧЫНА, ТАРДОУ, УСЕНКА, ФЕФЕР.

Кіеў.

СМУТКУЕМ РАЗАМ З ВАМІ

Глыбока ўзрушаны смерцю таленавіцейшага пісьменніка Совецкай Беларусі ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка. Смуткуем разам з вамі.

г. Масква. **Бюро нацкамісіі ССП СССР СКОСЫРЭУ.**

МЕНСК, САЮЗУ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Глыбока смуткуем з прычыны заўчаснай смерці Эдуарда Самуйлёнка. Выказваем спачуванне сям'і нябожчыка.

Ілья СЕЛЬВІНСКІ, Віктар ГУСЕУ, Аляксей ФАЙКО.

Кіславодск.

———o———

Дарагі друг, таварыш, брат

Апусцілася чырвона-чорная заслона небыцця над маладым совецкім пісьменнікам-ордэнаносцам Эдуардам Самуйлёнкам. Загінуў вялікі мастацкі талент, поўны парыву да творчасці, поўны энергіі, поўны замілавання да нашай вялікай совецкай радзімы.

«Тэорыя Каленбрун», «Будучыня», «Пагібель воўка» — творы, праніхнутыя шчырым паэтычным пафасам, чыстапробнай лірыкай, глыбокім прагнозам, гарачым натхненнем. Гэтыя творы стаяць у першым радзе совецкай літаратуры.

П'есу «Пагібель воўка» Самуйлёнак напісаў у апошнія месяцы жыцця. Ён гарэў творчым запалам і згараў. «Часу няма хварэць», — гаварыў ён.

Ён дапісваў апошнія абзацы п'есы пры высокай тэмпературы. Слабелі пальцы, з рук выпадала пяро. Ён напружваў апошнія сілы і скончыў твор.

«Часу няма хварэць». Ён працаваў над планам другога тома рамана «Будучыня», але бязлітасная смерць ужо стаяла над ім. Пакуль пісьменнік канчаткова не занядужаў, ён тварыў...

Найвялікшае шчасце — тварыць для гераічнага совецкага народа. Эдуард Самуйлёнак працаваў як лепшы сын свайго народа, як большэвік, як герой.

Не раз ён апавядаў аб сваіх творчых планах, аб сваёй нястомнай працы.

Калі мы, беларускія пісьменнікі, атрымалі высокую ўзнагароду ад совецкага ўрада, ад партыі, ад народа, наша вялікае шчасце было зацемнена цяжкім занядужаннем Эдуарда Самуйлёнка. Ён не быў разам з намі ў рубінавазорным Крэмлі. Усе мы, тоячыся адзін ад другога, выціралі слёзы. Мы ўжо ведалі, што паратунку для Самуйлёнка няма.

Рускія пісьменнікі ведалі пра стан яго здароўя, цікавіліся, пыталіся ў нас. Іх лепшыя пажаданні нам былі тыя, калі ва ўзаемным віншаванні з высокай узнагародай яны жадалі выздараўлення Самуйлёнку.

А дарагі Эдуард у гэты час у марах сваіх бачыў Крэмль, бачыў сівабародага Міхаіла Іванавіча Калініна; ордэн — вышэйшая ўзнагарода за адданую працу — нібы гарэў і ззяў на яго грудзях. Гарачым сэрцам ён адчуваў гэты ордэн. Ён аддаў да апошняй кроплі сваё кіпучае жыццё за народ, за партыю Леніна—Сталіна.

У апошнія хвіліны жыцця ён марыў пра шчаслівае сёння і пра комуністычную сонечную будучыню.

Маўклівыя, сумныя, з апушчанымі галовамі, мы, беларускія пісьменнікі, сталі ля гроба нашага роднага, нашага таварыша. Слоў у нас няма, каб суцяшаць адзін другога. Утрата для беларускай літаратуры вельмі вялікая.

У гэтыя строгія, урачыстыя хвіліны раздумнага маўчання кожны з нас, совецкіх пісьменнікаў, думае адно:

— Працаваць з натхненнем, так энергічна і няспынна на карысць свайго народа, як працаваў Эдуард Самуйлёнак, як вучыць працаваць вялікая партыя Леніна — Сталіна, як вучыць працаваць любімы Сталін.

Спі, дарагі друг, таварыш, брат. Высокамастацкія творы, выпеставаныя тваім шчырым сэрцам, тваімі ўзлётнымі думкамі, будуць жыць доўга-доўга. Гэта значыць, што будзеш жыць ты сам.

Вялікі совецкі народ, які ты так любіў, гераічныя ўчынкі якога так натхнялі цябе, якому ты аддаў сваё маладое жыццё палкам, да апошняга ўздыху,—ніколі цябе не забудзе.

Нізка схіляем галовы перад табой.

Змітрок БЯДУЛЯ.

ЁН ГОРАЧА ЛЮБІЎ СВОЙ НАРОД

Глыбока патрасён бясчаснай смерцю аднаго з лепшых пісьменнікаў беларускага народа, ордэнаносца Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка, памёршага ў росквіце творчых сіл, марыўшага аб выдатных творчых замыслах, горача любіўшага свой народ, сваю совецкую радзіму.

Смерць вырвала з нашых радоў чалавека вялікага таленту, вялікіх магчымасцей.

Вечная слава неўвядаемаму слову мастака. Памяць аб ім будзе вечнай у нашых сэрцах.

МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ.

Кіславодск.

СЭРЦА ТВАЁ Б'ЕЦЦА У КНІГАХ ТВАІХ...

Бязлітасная смерць навек адлучыла ад нас высока-благароднага чалавека і пісьменніка. З нашай літаратурнай сям'і назаўсёды выбыў наш добры таварыш і верны друг Эдуард Людвігавіч Самуйлёнак. Горкай скрухай напоўніла гэта вестка маё сэрца. Кропляй уцехі ў вялікім горы служыць перакананне, што Эдуард Людвігавіч, чалавек крэпкага таленту, пражыў сваё кароткае, але яркае жыццё не дарам — ён пакінуў сучаснікам і патомкам крыштальны дар сваёй яснай душы, свае высокамастацкія творы. Ягонай памяці не зацярусіць пыл вякоў.

Спакойна спі, дарагі друг і брат, — ты з намі, ты сярод нас, сэрца тваё б'ецца ў кнігах тваіх... **Пятро ГЛЕБКА.**

У СОВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЁН ЖЫВЕ І БУДЗЕ ЖЫЦЬ

Эдуард чытаў ціха, але кожнае яго слова даходзіла да слухача. Я помню адно з апошніх выступленняў Самуйлёнка, калі перапоўненая чырвонаармейцамі зала дрыжэла ад узбуджэння. Самуйлёнак чытаў пра Іспанію. Голас яго перарываўся. Ён не ведаў тады, што да яго прыступіла страшэнная хвароба. Глыбокі змест апавядання, высокае майстэрства, пачуццё класавай накіраванасці захаплялі ўсіх.

Не верыцца, што ўжо няма Эдуарда — вясёлага таварыша, удумлівага мастака. У яго было вельмі многа планаў. Будучы хворым, працуючы над цудоўным раманам «Будучыня» і п'есай «Пагібель воўка», ён выношваў ужо далейшыя свае работы. Незадоўга перад смерцю ён узяў для перакладу «Песню про купца Калашникова» М. Ю. Лермантава, але цяжкая хвароба не дала магчымасці выканаць задуманае.

Эдуард Самуйлёнак вельмі клапаціўся аб грамадскім жыцці пісьменніка. Ён біў дамаседства, нерухавасць. Заўсёды ўсім раіў больш выязджаць у раёны, у калгасы. Эдуард ведаў, што толькі цесна жывучы з глыбінямі народа можна стварыць выдатныя творы.

Дарагі друг Эдуард! Пра цябе можна пісаць многа. Ты пражыў кароткае але слаўнае жыццё. Сягоння, праводзячы цябе ў апошнюю дарогу, хочацца сказаць, што ў совецкай літаратуры ты жывы, ніколі не памрэш, вечна будзеш жыць. **Пятрусь БРОУКА.**

КУЛЬТУРНЕЙШЫ ЧАЛАВЕК, ТАЛЕНАВІТЫ ПІСЬМЕННІК

Нават нам, хто бачыў апошнія хвіліны жыцця Эдуарда Самуйлёнка, цяжка паверыць, што яго ўжо няма сярод нас, што навекі адышоў ад нас гэты вялікі, жыццёрадасны, поўны творчых сіл і імкненняў чалавек. Кожны з нас помніць Эдуарда вечна хвалюючымся за справу нашай літаратуры, радуючымся яе поспехам, страсна абмяркоўваючым праблемы літаратуры. У яго заўсёды быў свой ясны, прадуманы погляд на рэчы, свае важкія думы. Ён выказваў іх акружаючым яго пісьменнікам, імкнучыся як і сваёй творчасцю ўзнімаць літаратуру на вышэйшую ступень. Ён працаваў ур'ёзна і ўважліва над любым творам, будзь то невялікае апавяданне ці вялікі раман. Ён працаваў упарта і многа, увесь аддаючыся рабоце, забываючы сябе за работай. Усё яго жыццё было творчым гарэннем за радзіму, за народ, за партыю, за комунізм. Кожнае слова яго было накіравана на іх карысць, для іх перамогі. Як многа мог-бы яшчэ зрабіць гэты поўны сіл і энергіі, культурнейшы чалавек, таленавіты пісьменнік, калі-б не зламала яго ў часе самага росквіту бязлітасная смерць!

Бывай, наш таварыш, наш Эдуард! Мы захаваем у нашых сэрцах і твой светлы вобраз, і прыклад тваёй работы, і тваю адданасць справе пралетарыята.

М. КЛІМКОВІЧ.



Цела пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка ў гробе.

ЛЯ ГРОБА

У гробе, апавітым вянкамі жывых кветак, ляжыць чалавек крыштальнай чысціні, вялікай гуманнасці, мужнасці і нястомнасці. У гробе, апавітым чорнымі лентамі і яркім кумачом, ляжыць таленавіты пісьменнік-ордэнаносец, сталінскі пітомец Эдуард Самуйлёнак.

У ганаровым карауле стаяць сябры па творчай рабоце — народныя паэты-ордэнаносцы Янка Купала і Якуб Колас, старэйшы беларускі пісьменнік-ордэнаносец Змітрок Бядуля, паэт-ордэнаносец Пятро Глебка. Яны доўга ўзіраюцца ў знаёмае аблічча. Ім цяжка расстацца з чалавекам, з якім яны разам тварылі, сябравалі.

Не змаўкаюць гукі жалобнай музыкі. Міма гроба няспынным патокам ідуць артысты, настаўнікі, мастакі, служачыя, стаханаўцы соцыялістычнай прамысловасці. Школьнікі, піонеры, студэнты доўга ўглядаюцца ў аблічча любімага пісьменніка. Артысты Тэатра оперы і балета, Менскага драматычнага і Віцебскага драматычнага тэатраў прынеслі вянкі.

У ганаровы караул сталі вартавыя радзімы — курсанты-байцы. Яны аддаюць Самуйлёнку па яго выдатных творах, разам з усім беларускім народам падзяляюць яны цяжар вялікай утраты.

Да гроба пісьменніка падышлі дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тт. Значонак, Рачок, Мацюшэнка, Макарэнка, дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тт. Міклашэўская, Рутхоўскі, Краўчанка, ордэнаносцы тт. Парахонька, Клімянкоў і інш.

А людзі ідуць няспынным патокам. Яны нясуць кветкі, нясуць да гроба пісьменніка свой боль і смутак. Яны прышлі развітацца з дарагім таварышам Эдуардам Людвігавічам Самуйлёнкам.

Апошні шлях

К Дому пісьменніка няспынна цякуць людскія патокі. З кветкамі з вянкамі, з акаймлёнымі крэпам сцягамі ідуць артысты, работнікі навукі і мастацтва, стаханаўцы соцыялістычнай прамысловасці, служачыя, студэнты, школьнікі.

Вуліцы запоўнены народам. Тысячы працоўных прышлі развітацца са сваім пісьменнікам, у апошні раз зірнуць на дарагое аблічча, каб навек захаваць у сваіх сэрцах, у сваёй памяці светлы, благародны вобраз выдатнага майстра мастацкага слова, творца соцыялістычнай культуры.

Велічна і сурова гучыць жалобны марш. Сябры па творчай рабоце — народныя паэты рэспублікі Янка Купала, Якуб Колас, паэты-ордэнаносцы Пятро Глебка і Пятрусь Броўка, пісьменнік-ордэнаносец Змітрок Бядуля і члены ўрадавай камісіі шаноўна, як дарагі скарб, выносяць на вуліцу гроб з целам любімага пісьменніка. Невыказнае гора, вялікі смутак сціскаюць сэрца і ніхто не саромецца выціраць слёзы, калі апавітая крэпам машына з гробам пісьменніка адпраўляецца ў апошні шлях.

Совецкая вуліца пасыпана жоўтым пяском. Вуліца тоне ў вянках жывых кветак, палымнее кумачом, апавітым крэпам. Ціха і павольна ідуць тысячы людзей за гробам таго, хто быў ім так дораг.

Апошні шлях!.. Вось і могілкі. Ужо відаць верхавіны кучаравых сосен. Смалістыя дрэвы перашэптваюцца таямніча, трывожна. Машына з гробам Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка спыняецца ля свежай магілы. Кружацца, крыляюць белыя сняжынкі, нібы хочуць прыхарошыць гэты цёмны дол, прыкрыць сабою жоўты жвір.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Папкоў адкрывае жалобны мітынг. Ад імя СНК БССР, ЦК КП(б)Б і Вярхоўнага Совета БССР выступае сакратар Менскага абкома КП(б)Б тав. Матвееў.

— Мы расстаёмся, — гаворыць ён,— з таленавітым пісьменнікам, з нястомным будаўніком соцыялістычнай культуры...

Народны паэт рэспублікі — ордэнаносец Янка Купала чытае свой верш, прысвечаны памяці Эдуарда Самуйлёнка. Затым выступае паэт-ордэнаносец Пятро Глебка.

— Мы сталі над адкрытай магілай, — гаворыць ён, — мы праводзім у апошні шлях свайго вернага друга, выдатнага пісьменніка Эдуарда Самуйлёнка. Лепшым і неўміручым помнікам яму застануцца яго высокамастацкія творы.

— Побач з магілай Эдуарда Людвігавіча, — гаворыць заслужаны артыст БССР тав. Рахленка, — магіла выдатнага майстра сцэны Крыловіча. Гэта два творцы, два мастакі, якія да апошняга ўздыху, да апошняй кроплі аддалі сваё жыццё, свае здольнасці на роскві соцыялістычнай культуры.

Ад рабочых горада Менска з прамовай выступіў рабочы завода імя Кірава тав. Тыліндус.

Гроб з целам Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка апускаюць у магілу. Зямля, якую так любіў Эдуард Самуйлёнак, прымае яго прах.

Спакой і мір твайму праху, дарагі наш друг! Твой светлы вобраз будзе для нас жывым прыкладам барацьбы, творчай працы, шчырага служэння Радзіме. Бывай, таварыш!

ТРАУРНЫ МІТЫНГ НА МОГІЛКАХ

ПРАМОВА тав. А. МАТВЕЕВА

(САКРАТАР МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б)

Таварышы! 12 лютага 1939 года на 32-м годзе жыцця памёр пасля цяжкай хваробы таленавіты пісьменнік БССР—ордэнаносец Эдуард Людвігавіч Самуйлёнак.

Горача любячы нашу радзіму, яе верны сын, выхаваны комсамолам і комуністычнай партыяй, Эдуард Людвігавіч Самуйлёнак яшчэ юнаком прышоў у беларускую совецкую літаратуру і аддаў ёй усё сваё кароткае жыццё. Усе свае сілы і здольнасці Эдуард Самуйлёнак аддаў на карысць совецкага народа, на карысць вялікай справы партыі Леніна—Сталіна.

У 17-гадовым узросце Самуйлёнак уступае ў ленінскі комсамол і вядзе там вялікую арганізацыйную і культурную работу. Жывучы паблізу ад дзяржаўнай граніцы, Самуйлёнак і яго таварышы — комсамольцы аказвалі вялікую дапамогу пагранічнікам ў барацьбе з контрабандыстамі і шпіёнамі.

Багатае ўражаннямі пагранічнае жыццё, класавая барацьба ў вёсцы і прынцыпальная наглядальнасць комсамольца далі яму невычарпальны матэрыял для будучай літаратурнай дзейнасці.

К гэтаму-ж часу адносяцца і яго першыя літаратурныя пачынанні. У 1928 годзе ў полацкай акруговай газеце з'явіліся яго паэма пра партызан і некалькі вершаў.

За невялікі час сваёй літаратурнай дзейнасці Самуйлёнак абагаціў беларускую совецкую літаратуру творамі, якія любіць наш чытач, якія сталі славай і гордасцю нашай совецкай літаратуры.

Самуйлёнак першы ў беларускай літаратуры напісаў твор аб брацкім грузінскім народзе.

У рамане «Будучыня» Самуйлёнак з выключнай праўдзівасцю і мастацкай яркасцю паказаў гераічную барацьбу грузінскага народа супроць здраднікаў-меншавікоў і ролю вялікага Сталіна ў барацьбе за перамогу соцыялістычнай рэволюцыі.

У асобе Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка мы страцілі палкага агітатара і прапагандыста ідэй комунізма і брацкай дружбы народаў многанацыянальнага Совецкага Саюза.

У асобе Эдуарда Людвігавіча мы страцілі таленавітага пісьменніка, поўнага волі і энергіі, поўнага смелых творчых замыслаў.

Партыя і ўрад высока ацанілі заслугі Эдуарда Людвігавіча. 31 студзеня 1939 года Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ён узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Атрымаўшы радасную вестку аб узнагародзе, Самуйлёнак пісаў:

«Выказваю сваю радасць і падзяку за высокую ўзнагароду, якой удастоілі мяне партыя і ўрад. Гэта высокая ацэнка маёй работы.

У дні падрыхтоўкі да гістарычнага XVIII з'езда нашай любімай комуністычнай партыі, калі совецкая краіна падводзіць вынікі вялікіх перамог соцыялізма, я заяўляю, што аддам усе свае сілы і здольнасці пісьменніка на карысць маёй горача любімай радзімы».

Няўмольная смерць не дала ажыццявіцца гэтым мыслям, яна абарвала поўнае творчай энергіі жыццё Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка.

Выдатныя творы таварыша Самуйлёнка, апяваючыя перамогі соцыялізма, перамогі нашай цудоўнай радзімы, астануцца назаўсёды ў памяці беларускага народа.

ПРАМОВА тав. Л. РАХЛЕНКА

(ЗАСЛУЖАНЫ АРТЫСТ БССР)

Таварышы, перастала біцца гарачае сэрца 32-гадовага пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка.

Неяк не верыцца, не хочацца верыць, што ў наша новае, сонечнае, соцыялістычнае жыццё можа так жорстка, так няўмольна прысці смерць і вырваць з нашай соцыялістычнай сям'і яе выдатнага 32-гадовага прадстаўніка ў самым росквіце сваіх творчых сіл, таленту і майстэрства.

Вялікі наш смутак. Ушоў з жыцця таленавіты, натхнёны, прынцыповы совецкі мастак, які даў-бы нашаму народу яшчэ многа і многа глыбока-ідэйных мастацкіх твораў, якія-б служылі вялікай справе комуністычнага выхавання чалавецтва.

Апошнія поўгода Эдуард Самуйлёнак, не гледзячы на цяжкую хваробу, пісаў для нашага тэатра п'есу «Пагібель воўка». І ён напісаў яе. Яна з'яўляецца адной з лепшых п'ес совецкай драматургіі, напісаных за апошнія годы. П'еса гэта гаворыць аб новым, шчаслівым жыцці свабоднага беларускага народа, аб слаўных пагранічніках, свята абараняючых соцыялістычныя рубяжы нашай радзімы.

Апошні месяц, ужо лежачы ў пасцелі, ён упорна, настойліва думаў і працаваў над паляпшэннем некаторых месц п'есы і яе вобразаў. Ён моцна трымаў пяро ў руках ён не хацеў расставацца з ім.

Працяг на 4-й стар.

ЭДУАРД ЛЮДВІГАВІЧ САМУЙЛЁНАК

БЫВАЙ, НАШ БЛІЗКІ, ДАРАГІ ТАВАРЫШ!

Цяжкую ўтрату панесла совецкая літаратура. У росквіце творчых сіл, зломлены цяжкай хваробай, памёр таленавіты пісьменнік БССР ордэнаносец Эдуард Людвігавіч Самуйлёнак.

Прышоўшы юнаком у беларускую совецкую літаратуру, Эдуард аддаў ёй усё сваё кароткае жыццё. Чалавек вялікага таленту і выключнай працаздольнасці, ён здолеў у параўнаўча кароткі час абагаціць беларускую совецкую літаратуру творамі, якія горача палюбіў наш чытач, якія сталі славай і гордасцю нашай літаратуры.

Горача любячы нашу радзіму, верны сын яе, выхаваны і выведзены на дарогу творца-мастака комсамолам, большэвіцкай партыяй, Эдуард Самуйлёнак усе свае сілы і здольнасці аддаў на карысць совецкага народа, на карысць вялікай справы Леніна—Сталіна.

Скаваны цяжкай хваробай, Эдуард ні на мінуту не спыняў творчай работы. Яго працаздольнасць, безупынная праца творчасці — прыклад самаадданага служэння мастацтву. За невялікі час, будучы ўжо хворым, Эдуард напісаў выдатны раман «Будучыня» і п'есу «Пагібель воўка». Ён першым у беларускай літаратуры напісаў твор аб брацкім грузінскім народзе, увасабляючы дружбу народаў нашай радзімы. У рамане «Будучыня» пісьменнік з выключнай мастацкай яркасцю і праўдзівасцю паказаў барацьбу брацкага нам грузінскага народа супроць здраднікаў-меншавікоў. Ён паказаў ролю вялікага Сталіна ў барацьбе за перамогу соцыялістычнай рэволюцыі.

П'еса «Пагібель воўка», якую хутка ўбачыць глядач са сцэны нашых тэатраў, служыць узорам твора большэвіцкага мастацтва.

Прыкаваны да пасцелі, Самуйлёнак пісаў аб гераізме і бясстрашнасці смелых, чэсных людзей, аб радасным жыцці. Усе яго творы — аповесць «Тэорыя Каленбрун», кнігі апавяданняў, раман «Будучыня», п'еса «Пагібель воўка» — поўны гарачага пачуцця інтэрнацыяналізма.

Сваёй творчасцю Эдуард Самуйлёнак славіў веліч нашай соцыялістычнай рэчаіснасці, гераічны шлях комуністычнай партыі, гераічную барацьбу совецкага народа супроць заклятых ворагаў — подлых здраднікаў, наймітаў фашызма.

Совецкі ўрад высока ацаніў заслугі пісьменніка. У ліку лепшых майстраў мастацкага слова Саюза ССР Эдуард Самуйлёнак узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Да самай апошняй мінуты свайго жыцця хворы Эдуард мужна супраціўляўся смерці. Ён любіў жыццё, імкнуўся зрабіць як мага больш, лепш, марыў напісаць яшчэ многа твораў пра наша сонечнае сёння, аб велічы сталінскай эпохі. Ён быў поўны смелых творчых замыслаў. Ён натхнёна гаварыў аб новых творах, якія пакажуць ва ўсёй гераічнай велічы справы комуністычнай партыі і вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна.

Вось чаму так цяжка адчуваць вялікую ўтрату, якую панесла наша совецкая літаратура.

Бывай, Эдуард! Бывай наш блізкі дарагі таварыш! Твой светлы вобраз, вобраз жыццерадаснага, палкага мастака, крыштальна чэснага сына нашай радзімы, мы захаваем у сваёй памяці, у сваіх сэрцах. Твае творы будуць жыць у совецкай літаратуры, радаваць і натхняць наш народ.

ЯНКА КУПАЛА, ЯКУБ КОЛАС, ЗМІТРОК БЯДУЛЯ, МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ, ПЯТРУСЬ БРОЎКА, ПЯТРО ГЛЕБКА, М. КЛІМКОВІЧ, К. КРАПІВА, І. ГУРСКІ, А. КУЛЯШОЎ, З. АКСЕЛЬРОД, Г. КАМЯНЕЦКІ, І. ШАПАВАЛАЎ, Э. АГНЯЦВЕТ, М. ПАСЛЯДОВІЧ, Р. МУРАШКА, М. ЛІЎШЫЦ, Х. ШЫНКЛЕР, Е. РАМАНОВІЧ, А. КУЧАР, М. МОДЭЛЬ, В. ВОЛЬСКІ, У. ФІНКЕЛЬ, А. ЯКІМОВІЧ, А. СТАХОВІЧ, Э. КАГАН, Х. МАЛЬЦІНСКІ, П. ПАНЧАНКА, С. КАГАН, А. ЖАУРУК, М. ЛАРЧАНКА, А. УШАКОЎ, В. КРАЎЧАНКА, В. ГЛАЗЫРЫН, Ю. ВІЦЬБІЧ, А. МІРОВІЧ, Я. МАЎР, Г. ШВЕДЗІК, Ю. ДВОРКІНА, А. ЕСАКОЎ, В. КАНДРАЦЕНЯ.

СХІЛЯЕМ НАШЫ ГАЛОВЫ

Яўрэйскія пісьменнікі БССР глыбока смуткуюць з прычыны цяжкага ўдару, які панесла совецкая літаратура, — заўчаснай смерці пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка.

Мы ўсе ведалі Эдуарда як буйнага пісьменніка, надзвычай добрага друга і таварыша. Яго творы занялі ганаровае месца між лепшых тварэнняў совецкай літаратуры.

З намі няма незабыўнага Эдуарда — гэтаму цяжка паверыць. Мы схіляем нашы галовы над тваім грobам, дарагі друг і таварыш. Мы цябе не забудзем!

З. АКСЕЛЬРОД, Г. БЯРОЗКІН, М. ГРУБ'ЯН, Г. КАМЯНЕЦКІ, Э. КАГАН, С. КАГАН, М. ЛІЎШЫЦ, Х. МАЛЬЦІНСКІ, А. ПЛАТНЕР, І. СЯРЭБРАНЫ, З. ТЕЛЕСІН, Л. ТАЛАЛАЙ, У. ФІНКЕЛЬ, Р. РЭЙЗІН, Г. ШВЕДЗІК.



Э. Л. САМУЙЛЁНАК, 1938 г. Крым. Лівадзія.

БЫВАЙ, ЛЮБЫ ДРУГ, БЫВАЙ, ТАВАРЫШ ПА РАБОЦЕ

Яшчэ так нядаўна Эдуард Самуйлёнак дзяліўся з намі сваімі творчымі планамі. Ён радаваўся кожнаму дасягненню беларускай культуры, сачыў за ростам яе творчых сіл, ганарыўся поспехамі пісьменнікаў, паэтаў, артыстаў, мастакоў нашай ордэнаноснай рэспублікі. І сам ён да канца аддаваў усе свае здольнасці і сілы, усю страсць свайго гарачага сэрца росквіту нашай літаратуры і мастацтва, нашай культуры.

Эдуарда Самуйлёнка паважалі ўсе. Мы, работнікі газеты, любілі ў ім скромнага, чулага і разам з тым патрабавальнага да сябе і другіх пісьменніка і журналіста. Ніколі не забудзем мы тых дзён, калі таленавіты пісьменнік узначальваў літаратурны аддзел нашай газеты, быў адказным сакратаром рэдакцыі. Ён патрабаваў, каб кожны радок у газеце быў прасякнут ваяўнічай партыйнасцю і прынцыповасцю. Кожны з нас ад усёй душы віншаваў Эдуарда Людвігавіча, калі партыя і совецкі ўрад адзначылі яго творчыя дасягненні ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Мы марылі аб выздараўленні пісьменніка-ордэнаносца, нам так хацелася бачыць яго сярод нас здаровым і папранейшаму поўным творчых сіл. Смерць няўмольна разлучыла нас з Эдуардам...

...Бывай, Эдуард, бывай друг, таварыш! Твой светлы вобраз, тваё жыццё, твая творчасць, твая вялікая любоў да радзімы заўсёды будзе прыкладам для кожнага з нас.

Група супрацоўнікаў газеты «Літаратура і мастацтва»: І. ГУРСКІ, А. ВАРАШЫЛАЎ, А. АСТРЭЙКА, Я. ГЕРЦОВІЧ, А. ЕСАКОЎ, Ю. РУДЗЬКО, Р. ЛЫНЬКОЎ, К. ЦІТОЎ, А. БЯЛЕВІЧ, Х. ШЫНКЛЕР, Ц. КРЫСЬКО, І. ПРАЎДЗІН, Н. ГУРЛО, С. ЯЛАВА, І. ІВАНОЎСКАЯ, М. МАЗО.

ВЫДАТНЫ МАЙСТАР

Памёр Эдуард Самуйлёнак — выдатны і своеасаблівы майстар беларускай совецкай літаратуры. Адышоў у росквіце год і творчых сіл выдатны друг і таварыш, незабыўны Эдуард. Мы, блізка ведаўшыя яго, сябраваўшыя з ім на працягу раду год, заўсёды здзіўляліся паўнаце жыццёвых сіл, клакатаўшых у Эдуардзе. Ён любіў сваю справу, вясёлую і цяжкую, ён гэтай справе — справе мастацтва, справе літаратуры — прысвяціў сваё жыццё. Дробнае, звычайнае яго не займала. У літаратуры ён любіў войстрыя калізіі, драматычныя сюжэты. Самуйлёнак з'яўляўся непраўзайдзёным майстрам сюжэта ва ўсёй беларускай літаратуры і не выпадкова ён прышоў у тэатр, стварыў п'есу, якая па-праву можа служыць упрыгожаннем рэпертуару нашых лепшых тэатраў. П'еса гэта — «Пагібель воўка».

Такія пісьменнікі, як Эдуард Самуйлёнак, самі сабою, сваім жыццём, сваёю творчасцю сцвярджаюць разуменне мастацтва, як справы найвялікшай адказнасці і найвялікшай цяжкасці, і ён, хворы, прыкаваны да пасцелі смяртэльнай хваробай, пішучы раман аб тым, як здаровыя і чэсныя людзі цаною жыцця здабывалі будучыню,— хіба не ўзор геройства, мужнасці, непараўнанага совецкага подзвіга?

Сапраўднае мастацтва карэннямі сваімі ўваходзіць у народ, у яго штодзённую практыку, у яго гераічнае мінулае, у яго гераічнае сёння. Самуйлёнак гэта разумеў і таму ствараў творы вялікай уздзейнічаючай сілы, творы нягаснучага значэння.

Першым буйным творам Самуйлёнка, стварыўшым яму вялікую вядомасць сярод чытачоў, з'явілася антыфашысцкая аповесць «Тэорыя Каленбрун». На аснове гэтай кнігі Самуйлёнак пазней напісаў сваю першую п'есу «Сержант Дроб», якая павінна быць зноў пастаўлена нашымі тэатрамі.

Найбольш буйным па размерах і спелым па замыслу і выкананню творам Самуйлёнка з'яўляецца вялікі раман «Будучыня». У гэтым рамане Самуйлёнак змог падмацаваць сваё бліскучае майстэрства будаваць сюжэт не менш каштоўнай якасцю майстра псіхалагічнага рамана. І гэта сваё ўзмацнеўшае майстэрства Самуйлёнак цалкам падпарадкаваў задачы стварэння жывых і цэльных чалавечых вобразаў грузінскіх рабочых і сялян. Сваім раманам «Будучыня» Эдуард Самуйлёнак шырока рассунуў тэматычныя рамкі беларускай літаратуры, надаў ёй шырыню творчых інтарэсаў, якой ёй часам нехапала. Эдуард любіў Грузію, ведаў яе песні, вывучаў яе мову. Па шырыні духу, па багаццю творчых сіл, якія былі ўвасоблены ў ім, Эдуард быў сынам велічнай прыроды Грузіі. З якой любоўю Самуйлёнак абрысаваў у сваім рамане вобразы грузінскіх дзяцей — Іліко і Вано! Як ён любіў іх!

Аднойчы ён мне сказаў: «Калі-б я не быў пісьменнікам, я напэўна быў-бы кавалерыстам...» З пачуццём найвялікшай гордасці расказваў ён нам аб сваёй спецыяльнасці, аб спецыяльнасці кулямётчыка. Эдуард вельмі многа ведаў і вельмі многім цікавіўся. Ён хацеў ведаць усе прафесіі, усе рамёслы, але сам-на-сам з нейкай затоенай пяшчотнасцю, як бывае заўсёды, калі думаюць аб самым дарагім і самым заветным, ён думаў аб літаратуры. За некалькі дзён да сваёй смерці ён быў узнагароджан за літаратуру ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Ордэна Эдуард не пабачыў.

Бывай, Эдуард! Кнігі, народжаныя рэволюцыяй, не паміраюць.

Г. БЯРОЗКІН.

ТВОРЫ ЯГО БУДУЦЬ ЖЫЦЬ

Толькі некалькі дзён таму назад мы віталі нашага любімага пісьменніка з высокай узнагародай і адразу атрымалі адказную тэлеграму ад заўсёды чулага, любячага шчырых сяброў Эдуарда.

Амаль задыхаючыся, але ўсхвалявана і радасна, поўны ўдзячнасці партыі і ўраду, якія аказалі яму вялікае давер'е, ён пісаў аб жыцці, аб творчых планах, якія спадзяваўся ажыццявіць у імя самаго жыцця. Планаў было шмат, яскравых і хвалюючых, як яскрава і хвалююча наша соцыялістычная рэчаіснасць, як яскравы і хвалюючы справы нашага свабоднага шчаслівага народа, які ён любіў больш за ўсё.

А сёння мы глыбока смуткуем разам з усім народам аб заўчаснай утраце. Не стала гарачага патрыёта нашай радзімы, таленавітага сына беларускага народа, пісьменніка, які на славу свайго народа і любімай партыі большэвікоў стварыў бліскучыя творы, поўныя страсці, веры і агню.

Наш тэатр цяпер працуе над яго таленавітай п'есай «Пагібель воўка». Гэта сапраўдная песня новаму соцыялістычнаму жыццю, гэта яго песня новым людзям жыцця. І тэатр зробіць усё, каб гэтую песню праспяваць магутным і чыстым голасам, як магутны і чысты быў яе аўтар, памяць аб якім мы захаваем у сваіх сэрцах назаўсёды.

Наш жаль і боль аблягчае ўпэўненасць у тым, што народ не забудзе свайго пісьменніка-ордэнаносца. І як сказаў у сваім апошнім вершы народны паэт-ордэнаносец Янка Купала:

Жыць між людзей застанецца
Песня і Леніна ордэн.

Народны артыст БССР А. ІЛЬІНСКІ.
Заслужаныя артысты БССР
Р. КАШЭЛЬНІКАВА, П. МАЛЧАНАЎ, Ц. СЯРГЕЙЧЫК, Н. ЗВЕЗДАЧОТАЎ.
І. ВІНЬЯР, В. АКСЕНАЎ, І. ДОРСКІ.

ЭДУАРД САМУЙЛЁНАК

Памёр Эдуард Самуйлёнак...

Выдатны пісьменнік, цудоўны чалавек, верны таварыш.

Як ён любіў жыццё, як ён радаваўся кожнаму поспеху нашай краіны, як ён люта ненавідзеў ворагаў!

Усе, хто ведаў Эдуарда, назаўсёды захаваюць у сваім сэрцы вобраз чулага таварыша, бязмерна клапатлівага ў дачыненні да кожнага, хто да яго звяртаўся за дапамогай ці парадай.

Вочы Эдуарда заўсёды свяціліся ласкай і цеплынёй, альбо нянавісцю, сарказмам і пагардай. Ён любіў усё таленавітае ў літаратуры, жывое, вдольнае і адносіўся да ўсяго гэтага з вялікай цеплынёй; ён ненавідзеў усё варожае, халтурнае — усё, што пахла прыспасабленцтвам.

Яго абурала несур'ёзнасць адносін некаторых пісьменнікаў да сваёй працы. Ён ненавідзеў пухлыя і рыхлыя, бязмерна доўгія опусы. З гэтага повaду ён гаварыў:

— Калі-б гэтыя кнігі былі дамамі, яны не прасталі-б і дзесяці хвілін. На іх месцы засталіся-б груды нядобраякаснай цэглы.

Бязмерна патрабавальны ў дачыненні да сябе мастак, ён заўсёды гаварыў аб нездаволенасці сваімі творамі, аб тым, што ён зможа стварыць творы куды большай сілы і глыбіні.

Як ясна працаваў гэты цудоўны розум нават у апошнія дні свайго жыцця! Прагна глытаючы паветра знясіленымі і пакалечанымі хваробай лёгкімі, Эдуард гаварыў:

— Паглядзіце, што я яшчэ напішу. Дайце мне толькі ўзняцца з пасцелі. Ды што з пасцелі! Няхай я крыху акрыяю, я і ў пасцелі буду пісаць.

Я не магу адкладваць, — гаварыў ён далей, — я мушу зараз-жа прыступіць да работы над другім томам рамана «Будучыня».

У яго галаве быў ужо да дробязей распрацаваны план гэтага тома.

Цяжка хворы Эдуард быў поўны аптымізму. Цудоўны гумар Эдуарда заўсёды нас чараваў.

Змрок... Надыходзіць вечар, у пакоі цямнее. Эдуард ляжыць, худы і даўгі, надзіва падобны па абрысах твару да Нікалая Астроўскага. Гаварыць яму цяжка. Ён часта кашляе. Голас бадай нячутны, але натхнёны. Ён гаворыць:

— Іліко ў мяне будзе капітанам авіяцыі. А Гвацыя—парабак Гамрэкелі — будзе старшынёй арцелі па вырабу квасу.

Вочы Эдуарда асвятляюцца ўсмешкай:

— А Гамрэкелі будзе прадаваць квас у адным з ларкоў, падпарадкаваных Гвацію. І Гвацыя абвяшчае загадам вымову Гамрэкелі за спазненне на работу... Вось камедыя... А Гамрэкелі спазніўся таму, што наведваў паміраючага Пачулія, які прызнаўся яму перад смерцю, што здзелку з баржай зрабіў выключна на грошы Гамрэкелі...

Цяжка хворы Эдуард Самуйлёнак быў поўны творчых ідэй. Колькі вялікіх замыслаў сыйшло ў магілу разам з гэтым выдатным пісьменнікам. Гэта быў чалавек, які жыў творчасцю штохвілінна, штодзённа, шточасна.

Эдуард Самуйлёнак быў выключна працаздольным. Творчая смеласць была яго характэрнай рысай. Ён заўсёды імкнуўся да новых тэм, да новых вобразаў. Яго захапляла ў жыцці многае. Гэта быў сапраўдны следапыт, які адкрываў у жыцці ўсё новыя і новыя рысы.

Ён ведаў прасторы сонечнай Грузіі, ведаў стэпы Украіны, ён ведаў назвы траў у полі, ведаў добра паляўнічую справу, любіў пейзаж нашага беларускага Палесся, ён ведаў вельмі многа пра рыб.

Аднойчы Эдуард на працягу некалькіх гадзін з вялікім веданнем справы гутарыў аб рыбах з рускім пісьменнікам Паўленка.

— Вам трэба аб рыбах пісаць! — усклікнуў Паўленка. — Вы так цудоўна ведаеце іх звычаі.

— І аб рыбах напішам, — сказаў Эдуард, усміхаючыся.

Эдуард быў патрабавальным да дэталей у мастацкім творы. Ён заўсёды здзекваўся з пісьменніка, калі той недакладна пісаў аб прыродзе, калі ён блытаў назвы, не ведаў натуры.

У Эдуарда Самуйлёнка было благароднае, крыштальна чыстае сэрца. Ён з вялікай любоўю гаварыў пра таварыша Сталіна, ён быў страсным патрыётам нашай радзімы.

***

Асноўным зместам творчасці Эдуарда Самуйлёнка трэба лічыць сцвярджэнне ідэі гуманізму—любві і павагі да працоўнага чалавека, нянавісці да ворагаў народа.

Эдуард ніколі не цураўся ў сваёй творчасці палітычнай злабадзённасці і актуальнасці — гэта мы бачым ужо ў яго першай буйнай аповесці «Тэорыя Каленбрун».

У гэтай кнізе Самуйлёнак выкрывае шпіёнскую тактыку фашысцкай Польшчы. Эдуарду Самуйлёнку ўдалося намаляваць рад яркіх характараў фашысцкіх заправіл. Вось маёр Каленбрун. Гэта хітры і каварны вораг. Яго выпрабаваны метад — правакацыя. Ён задумляе шырокі план перакідвання на совецкую тэрыторыю шпіёнаў пад выглядам членаў компартыі Польшчы і Заходняй Беларусі. І гэта яму часткова ўдаецца. Але Каленбрун не прыняў пад увагу комуністаў у польскай арміі, комуністаў на кожнай фабрыцы і заводзе. І яго правакацыя праваліласся. Кніга Эдуарда Самуйлёнка — хвалюючая кніга. У ёй вельмі добра напісана сцэна мітынга беспрацоўных у змооку асенняга парка ў Вільні. Надзвычайныя пейзажы: змрочныя, цяжкія, напоўненыя злавесным шумам асенніх дрэваў. Цёпла ў кнізе паказана развітанне двух большэвікоў — Марціна Крамарчыка і Чэста перад рашучым выступленнем компартыі супроць правакацыі фашыстаў.

Амаль аднначасова з «Тэорыяй Каленбрун» Самуйлёнак піша рад апавяданняў пра совецкую рэчаіснасць. З іх асабліва трэба вылучыць апавяданні «Паляўнічае шчасце» і «Пункт апоры». «Паляўнічае шчасце» паказвае паляўнічага-калгасніка Лаўрэна. Усё сваё жыццё ён марыў аб удачы паляўнічага — аб выдры. І вось ён патрапіў на яе след. Ён нават закрыў яе ў нары. Адна ноч — і шчасце яго вырашана. Але тут наўпярок яго «шчасцю» становіцца калгасны брыгадзір па ільну. Нехапае людзей, трэба трапаць лён уначы. На гэта мабілізуецца ўвесь калгас. І вось, перамагаючы нутраны боль, Лаўрэн прыходзіць да ракі, адкрывае нару і кажа: «Ну, што-ж, жыві, брат, выдра!»—і ідзе трапаць лён. Аказалася, што ў ільне, як для ўсяго калгаса, так і асабіста для Лаўрэна было куды большае шчасце, чым у выдры. Апрача таго, выдру і забіваць нельга было — не час палявання.

Апавяданне напісана задушэўна, цёпла. Лірычнымі фарбамі намаляваў пісьменнік вобраз Лаўрэна. Самуйлёнак выявіў добрае веданне прыроды, звера, яго звычак. Пісьменнік войстра адчувае рамантыку паляўнічай справы.

Для Самуйлёнка характэрна складанасць фабулы, насычанасць твораў дзеяннем, дынамічнасцю.

Зборнікі апавяданняў «Дачка эскадрона» і «Русалчыны сцежкі» ставяць складаныя праблемы нашай рэчаіснасці. Праблема гуманізму распрацоўваецца ў апавяданні «Асноўная ідэя». Барацьба народа супроць сваіх ворагаў у капіталістычных краінах паказана ў апавяданнях «Герой нацыі», «Урачыстая месса» і інш., рамантыка рэволюцыйнай барацьбы ў дні грамадзянскай вайны — у апавяданні «Пункт апоры».

Ва ўсіх гэтых творах мы адчуваем гарачы подых барацьбы, велізарную нянавісць аўтара да ворагаў працоўнага народа, смеласць у сюжэтнай пабудове, насычанасць яркімі фарбамі. Усюды Эдуард Самуйлёнак выступае перад намі як выдатны апавядальнік.

Усе пералічаныя вышэй творы з'яўляліся для аўтара падрыхтоўкай для пераходу да вялікіх эпічных палотнаў, да стварэння манументальнага твора аб нашай рэчаіснасці.

Пачаткам у здзейсненні гэтага замыслу быў вялікі раман «Будучыня».

***

У рамане «Будучыня» пісьменнік апавядае нам аб меншавіцкім разбойнічым панаванні над грузінскім народам у 1918 годзе. Самуйлёнак стварыў шырокую карціну народнага жыцця, народнага гора і пакут і гэта карціна выкрывае зверскае аблічча грузінскіх меншавікоў, зараджае ў душы чытача пачуццё велізарнай нянавісці да іх.

Ідэю рамана Эдуарда Самуйлёнка можна сфармуліраваць, як ідэю маральнай і інтэлектуальнай перавагі прадстаўнікоў працоўнага народа над эксплаататарамі. Маральная чыстата, непадкупнасць, вернасць абавязку, высокае пачуццё таварыскай салідарнасці, благародства праглядваюць з усіх учынкаў герояў рамана «Будучыня». Селянін Кверквелія забівае падатковага чыноўніка меншавіцкага ўрада за тое, што той груба і подла здзекваўся з сялян; большэвік-падпольшчык Курыдзе даглядае хворае беспрытульнае дзіцё, пакінутае на вуліцы; стары Топурыя афяруе сваім жыццём — ідзе проста ў лапы контрразведчыкаў, каб выратаваць партызанскі атрад; парабак Гвацыя ў невыказным гневе кідаецца на свайго гаспадара Сімона Гамрэкелі за тое, што той пасмеў крануць сірату Іліко.

Перачытваючы ўсе гэтыя карціны ў рамане Эдуарда Самуйлёнка, адчуваеш вялікую любоў аўтара і веру ў сілы, талент і доблесці гераічнага грузінскага народа. Эдуард Самуйлёнак, моцна верачы ў сілы працоўнага народа, паказвае сваіх герояў разумнымі, мыслячымі і чулымі.

У рамане ёсць цудоўны вобраз Топурыя. Праз вобраз Топурыя мы адчуваем воблік самога Эдуарда, выключна чэснага, любячага свой народ і моцна і гнеўна ненавідзячага ворагаў. Такім быў Эдуард усё сваё жыццё і гэта дало яму сілы тварыць яркія, хвалюючыя творы пра любоў да працоўнага чалавека, пра нянавісць да ворагаў.

Эдуард і ў жыцці быў чалавекам незвычайна назіральным. Ні адна яркая дэталь, ні адна арыгінальная праява чалавечага характару не праходзіла для яго незаўважанай. Яго характарыстыкі людзей былі дакладнымі, войстрымі і дасціпнымі, яго ўменне бачыць прыроду здзіўляла ўсіх.

Вялікую галерэю яркіх тыпаў і вобразаў стварыў Эдуард Самуйлёнак у творы «Будучыня», які з'яўляецца гордасцю беларускай літаратуры. І Топурыя, і аднарукі Міха, і Арцём Коркія, і Курыдзе, і Кверквелія, і Гвацыя, — усё гэта жывыя характары, яркія тыпы.

Глыбока хвалюе нас у рамане вобраз старога большэвіка Тэафіла Габісонія, які працаваў пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна два дзесяцігоддзі. Яго спатканне з Міхаілам, у часе якога ён апавядае аб сустрэчы разам з таварышам Сталіным 17 год назад новага года і аб вешчых словах, сказаных у тую ноч правадыром, патрасаюць чытача. Бяссонная ноч, праведзеная даўнішнімі таварышамі, паказана Самуйлёнкам з вялікім і шчырым пачуццём, з вялікай сілай.

У карціне сустрэчы Габісонія з Міхаілам Эдуард Самуйлёнак выразіў усю сваю вялікую любоў да таварыша Сталіна, усё сваё замілаванне да яго благароднага вобраза.

Да ліку лепшых вобразаў рамана Эдуарда Самуйлёнка адносяцца вобразы дзяцей. Іліко і Вано напісаны з тонкім разуменнем дзіцячай псіхалогіі, з пранікненнем у глыбіню іх душы. Асабліва чаруе нас Іліко. Яго размовы з Сімонам Гамрэкелі і развітанне з Вано — лепшыя старонкі ў кнізе Самуйлёнка і, бадай, ва ўсёй нашай літаратуры аб дзецях.

Раман «Будучыня» — толькі першая кніга вялікага твора, задуманага аўтарам аб совецкай Калхідзе. Гэта кніга запальвае чытача пачуццём вялікай любві к братняму нам гераічнаму грузінскаму народу, пачуццём нянавісці да ворагаў грузінскага народа, да меншавіцкіх гандляроў лёсам сонечнай Грузіі.

Нажаль, другі том гэтага рамана аўтару не суджана стварыць. Ён памёр, поўны думак аб сваім любімым дзецішчы, аб рамане «Будучыня», аб далейшым лёсе яго вобразаў.

Напісаная нядаўна Эдуардам Самуйлёнкам п'еса «Пагібель воўка» — выдатны твор совецкай літаратуры. Гэта п'еса прынята вельмі цёпла тэатральнай грамадскасцю Масквы, яна ўвойдзе ў рэпертуар лепшых тэатраў Совецкага Саюза.

П'еса з вялікай праўдзівасцю і шчырасцю паказвае сучасны беларускі пагранічны калгас. Цудоўныя, ледзь адцененыя гумарам фарбы ўжыў аўтар для паказу станоўчых людзей калгаса.

Мірон, Язэп, рыбак Анісім — усе гэтыя станоўчыя героі сучаснай вёскі не мысляць свайго існавання па-за калгасам. Ворагі народа з'яўляюцца іх асабістымі злейшымі ворагамі.

З якой мастацкай сілай паказаў аўтар у простанародным складзе развагі Язэпа пра тое, «што такое вораг»!

Найбольш ярка гумар Эд. Самуйлёнка праявіўся ў вобразе рыбака Анісіма, які прагнуў «увабраць сома» для калгаснага вечара і, нарэшце-такі «увабраў яго». У Эд. Самуйлёнка вобраз гэты намаляван да скульптурнасці рэльефна. Вось перад намі высокі кашчлявы чалавек, у вушах якога заўсёды поўна вады, таму ён гаворыць да ненатуральнасці гучна.

Намаляваны такімі фарбамі характар дае вялікія магчымасці актору. Моцнымі, смелымі фарбамі намаляваны Эдуардам вобразы ворагаў Харкевіча, Абабуркі. Гэта не карыкатурны і шаржыраваны вораг. Гэта вораг, які выклікае ў нас велізарную нянавісць. П'еса Самуйлёнка ўзбройвае нас на змаганне з гэтым ворагам.

Трэба сказаць, што драматургічны талент Эд. Самуйлёнка быў вельмі значным. І п'еса «Сержант Дроб» і, асабліва, «Пагібель воўка» разам з сюжэтнай напружанасцю, насычанасцю ўнутранай драматычнай дзеяй — даюць нам багата ярка намаляваных характараў людзей. Вось чаму нашы тэатры так ахвотна працавалі з Эд. Самуйлёнкам і захапляліся яго драматургічнымі творамі.

Пройдзе не шмат часу. У тэатрах успыхне святло рампы і героі п'есы «Пагібель воўка», якіх сваім выдатным выяўленнем выклікаў да жыцця Эд. Самуйлёнак, выйдуць на сцэну. Мы іх убачым. Але іх ужо не зможа ўбачыць знямелы навек аўтар.

***

Совецкі народ, партыя і ўрад высока ацанілі заслугі Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка ў развіцці совецкай літаратуры і ўзнагародзілі яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Якая гэта была радасць для ўсёй беларускай совецкай літаратуры, для ўсяго беларускага народа.

Імя Эдуарда Самуйлёнка стала адным з самых папулярных імён сярод шматмільённай масы чытачоў.

Ён быў сапраўдным падвіжнікам у літаратуры, які тварыў самаадцана, не лічачыся са сваім здароўем.

Партыі Леніна — Сталіна аддаў непартыйны большэвік Эдуард усё сваё палымнеючае жыццё.

І вось Эдуард мёртвы. Ён ляжыць маўклівы і нерухомы.

Над яго свежай магілай мы пабудуем помнік. Але вечны, лепшы помнік будзе збудаван яму ў нашых сэрцах. Беларускі народ ніколі не забудзе выдатнага пісьменніка Эдуарда Самуйлёнка.

А. КУЧАР.

ЭДУАРД ЛЮДВІГАВІЧ САМУЙЛЁНАК

ТРАУРНЫ МІТЫНГ НА МОГІЛКАХ

(ПРАЦЯГ ПРАМОВЫ тав. Л. РАХЛЕНКА)

Наш тэатр зараз працуе над гэтай п'есай. Мы пакажам яе таксама ў Маскве ў дэкаду беларускага совецкага мастацтва.

Цяжка, балюча адчуваць, што аўтар не дажыў да дня прэм'еры. Калі ён працаваў над п'есай, калі чытаў нам асобныя карціны, кавалкі, у яго вачах свяціўся сапраўдны творчы агонь таленавітага натхнёнага мастака.

Незадоўга да смерці ён задумаў новую п'есу. Гадзінамі нястомна гаварыў ён аб гэтай п'есе, аб яе тэме, сюжэце і вобразах. Ён гаварыў: «Вось закончу «Пагібель воўка», паеду ў Крым, пачну там другую частку рамана «Будучыня» і адначасова буду пісаць новую п'есу. Прыязджайце да мяне ў Крым, будзем гутарыць, спрачацца, марыць і чытаць».

Ён задумаў цікавую новую п'есу на вялікую хвалюючую тэму, на тэму аб таржастве совецкага гуманізма. Ім быў ужо дакладна распрацован сюжэт гэтай п'есы.

Я помню, як ён нервова хадзіў па сваім маленькім рабочым пакоі і весела, астраумна, тэмпераментна гаварыў аб планах і перспектывах сваёй далейшай працы.

Неяк увечары, пасля чыткі п'есы «Пагібель воўка», ён незвычайна задумліва сказаў мне: «Калі дажыву да лета, то другая мая п'еса будзе скончана». Гэта было сказана так проста і так мужна, што я зразумеў, што ён занадта добра ведае сваю хваробу і гатовы да ўсяго.

Потым ідучы па вуліцы, ён зноў гаварыў аб тым, што ў яго зараз вялікая прагнасць і энергія пісаць як мага больш і як мага лепш. Ён адчуваў сумны канец сваёй хваробы, але амаль ніколі не гаварыў аб гэтым.

Таварышы, тут, побач з гэтай свежай магілай Эдуарда Самуйлёнка, знаходзіцца магіла таленавітага і любімага артыста беларускага народа, заслужанага артыста БССР Владзіміра Нікалаевіча Крыловіча, які ў 42-гадовым узросце памёр ад рака печані.

І вось зараз мы назаўсёды развітваемся з таленавітым маладым пісьменнікам Эдуардам Самуйлёнкам, які памёр ад туберкулёза. Хочацца верыць, што блізкі той час, калі вызваленае і свабоднае чалавецтва зямнога шара знойдзе сродкі, каб назаўсёды знішчыць бацылы гэтых праклятых хвароб.

Бывай, дарагі таварыш. Лепшым помнікам на тваю бясчасную магілу будзе наша натхнёная жыватворчая праца на карысць нашага вялікага соцыялістычнага грамадства.

Ты з намі, у нашых думках і сэрцах. Ты з намі на нашых рэпетыцыях, ты жывеш у кожнай часцінцы сваіх вобразаў. Твой твор мы дастойна прадставім народу.

Мір праху твайму.

ПРАМОВА тав. М. ТЫЛІНДУСА

(СТАХАНОВЕЦ МЕНСКАГА СТАНКАБУДАУНІЧАГА ЗАВОДА ІМЯ КІРАВА)

Таварышы, пачуццё горычы і болю выклікае заўчасная смерць аднаго з таленавіцейшых беларускіх пісьменнікаў — Эдуарда Самуйлёнка. Сваёй творчасцю Эдуард славіў веліч нашай соцыялістычнай рэчаіснасці.

Творы Эдуарда Самуйлёнка карыстаюцца вялікай папулярнасцю і любоўю сярод чытачоў-стаханаўцаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў, сярод усіх рабочых і служачых завода імя Кірава.

Кнігі Самуйлёнка «Тэорыя Каленбрун», «Дачка эскадрона», «Будучыня» заўсёды на руках у чытачоў.

Глыбокая шчырасць, прастата і яснасць творчасці Эдуарда Самуйлёнка захапляюць чытачоў.

Совецкі ўрад высока ацаніў заслугі пісьменніка, узнагародзіўшы яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Бывай, дарагі друг, твае мастацкія творы будуць жыць доўга.

Вялікі совецкі народ ніколі цябе не забудзе. Ты будзеш жыць заўсёды ў сэрцах велізарнай арміі чытачоў.

Беларускі народ ніколі не забудзе свайго выдатнага пісьменніка. Светлы вобраз Эдуарда Самуйлёнка назаўсёды астанецца ў памяці ўсіх працоўных нашай рэспублікі.

ПРАМОВА тав. П. ГЛЕБКІ

(ПАЭТ—ОРДЭНАНОСЕЦ)

Таварышы, мы стаім над адкрытай магілай нашага блізкага друга і любімага таварыша. Мы праводзім у апошняе падарожжа і развітваемся з дастойным сынам нашай радзімы. Мы аддаём апошні доўг і пашану таму, каго мы так горача любілі і шчыра паважалі. Мы перадаём зямлі прах чалавека, які гэтак прагна любіў усё жывое...

Бязлітасная смерць навек адлучыла ад нас высока-благароднага чалавека і пісьменніка вялікага таленту Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка. Цяжкая невыказная страта горкім смуткам агарнула нашы сэрцы, сэрцы яго таварышаў і равеснікаў, сэрцы яго шматлікіх чытачоў. Кожны з прысутных тут ведае, што страціла беларуская совецкая літаратура ў асобе Эдуарда Самуйлёнка. Яна страціла аднаго з самых яркіх і самых плённых сваіх твapцоў, страціла яго ў росквіце творчых сіл і таленту, страціла пісьменніка высокай прынцыповасці, страснасці і крыштальнай чэснасці.

Сын чорнарабочага, узняты з народных глыбінь, выхаваны і выведзены на шырокую дарогу творчасці ленінска-сталінскай партыяй, Эдуард Самуйлёнак спалучаў у сабе лепшыя рысы нашага совецкага чалавека, грамадзяніна і пісьменніка. Ён быў дастойным сынам свайго вялікага народа. Праўдзівы і працавіты, беззаветна аддакы справе комунізма, поўны лютай нянавісці да ворагаў і самай чалавечнай любві да свайго народа, жыццёрадасны і тэмпераментны, дабратліва-касмешлівы і сардэчны, верны дружбе і сяброўству — такім паўстае перад намі адухатвораны воблік Эдуарда Самуйлёнка. Ва ўсім яго жыцці і дзейнасці не было нічога такога, у чым-бы ён не мог адкрыта і ясна прызнацца перад усімі. Ён смела стане перад судом сучаснікаў і патомкаў, як крыштальна чэсны чалавек і тварэц. Гэтым ён заваяваў сабе нашу агульную сардэчную любасць і шчырую пашану.

Ісціну высокіх слоў аб чалавечым прызначэнні і дастоінстве, аб чалавечай гордасці, якія Эдуард Самуйлёнак нязменна спаявшчаў у сваіх творах, ён таксама нязменна сцвярджаў сваім уласным жыццём. Адзін беларускі паэт, якога такім-жа маладым скасіла тая-ж няшчадная хвароба, пісаў незадоўга да сваёй смерці:

> Будзь-жа, век малады,
> Поўны светлымі днямі!
> Пралятайце гады
> Залатымі агнямі.

Здаецца, што гэтыя словы былі дэвізам, пад якім Эдуард Самуйлёнак дажываў свае апошнія месяцы. Яму нехапала часу, ён працаваў і працаваў. Ужо знясілены цяжкай хваробай, літаральна на смяротнай пасцелі, ён пісаў п'есу «Пагібель воўка», ён думаў над новымі творчымі планамі, ён гарэў новымі замысламі. Эдуард Самуйлёнак заўсёды працаваў і тварыў нястомна і прагна, так, як ён прагна імкнуўся жыць. Апошнія кроплі свайго жыцця ён пераліваў у свае творы. Яго светлая чыстая душа жыве ў яго ясных і празрыстых тварэннях. Самуйлёнак валодаў тым, што адно дае сэнс і жыццё мастацкаму твору,—ён валодаў велізарнай любасцю да жыцця і чалавека.

І ўсё, чым была багата незвычайная натура самога пісьменніка, знайшло сваё адлюстраванне ў яго творчасці. Яго творчасць — гэта самы верны адбітак, самы праўдзівы здымак з яго вобліка, як чалавека і грамадзяніна. Эдуард Самуйлёнак быў ясны і чысты, — і гэтай яснай празрыстасцю свецяцца яго творы.

Эдуард Самуйлёнак любіў зямлю і прыроду, — і свежым пахам лясоў, паэзіяй квітнеючай зямлі вее ад яго твораў. Эдуард Самуйлёнак не выносіў нікчэмнага і пошлага, і ён кляйміў яго ў сваіх творах, змагаючыся за высокае мастацтва соцыялізма. Эдуард Самуйлёнак усёй сваёй істотай ненавідзеў ворагаў соцыялізма, і ён няшчадна зрываў з іх маскі, кляйміў і граміў іх у сваіх творах. Эдуард Самуйлёнак любіў людзей, свой народ, сваю радзіму, — глыбокім патрыятызмам, глыбокім, самым чалавечным, совецкім гуманізмам пранікнута кожнае яго слова.

Эдуард Самуйлёнак па-праву насіў высокую сталінскую назву інжынера чалавечых душ. Ён прагна вывучаў і добра ведаў наша жыццё, ён глыбока пранікаў у псіхалогію людзей, у іхнія душы.

За сваю беззаветную работу ў славу нашай радзімы, ў славу вялікай партыі Леніна — Сталіна, Эдуард Самуйлёнак узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Эдуард Самуйлёнак заслужыў гэтую высокую ацэнку, якую даў яго творчасці народ. Раманы Эдуарда Самуйлёнка «Будучыня» і «Тэорыя Каленбрун», п'есы «Пагібель воўка» і «Сержант Дроб», яго аповесці і апавяданні — усё, што ён напісаў за сваё кароткае жыццё, узвышаюцца над яго заўчаснай магілай манументальным помнікам. Усведамленне гэтага служыць кропляй уцехі ў нашым бязмежным горы. Смерць не здолела цалкам забраць ад нас Эдуарда Самуйлёнка. Сучаснікам і патомкам астаўся крыштальны дар яго душы і сэрца — яго высокамастацкія творы.

Спакойна-ж спі, наш дарагі друг і брат, ты з намі, ты сярод нас. Тваё жывое сэрца пад ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга б'ецца ў тваіх кнігах. Памяць аб табе будзе жыць у думках і сэрцах народа.

Няхай гэты жвір, які мы сыплем на тваю свежую магілу, будзе лёгкім для цябе, як лёгка ты ўзлятаў да мастацкіх вышынь, да ўсяго светлага і сонечнага.

Бывай, наш добры і дарагі Эдуард!

Спакой і мір твайму праху і вечная слава тваім творам!

БЛІЗКІ ДРУГ, ВЫДАТНЫ ПІСЬМЕННІК

З глыбокім смуткам, са слязамі на вачах праводзім мы сёння ў апошняе падарожжа нашага блізкага друга, выдатнага пісьменніка Эдуарда Самуйлёнка. Цяжка паверыць, што мы ніколі больш не пабачым яго сярод нас, не пачуем яго вострых жартаў, яго ўсхваляваных прамоў аб літаратуры, аб яе мэтах, аб высокім ідэале совецкага пісьменніка і грамадзяніна. Заўсёды строгі да сябе і другіх, ён не цярпеў лёгкадумных абывательскіх адносін да працы пісьменніка і бязлітасна высмейваў халтуру і прыспасабленцтва.

Тварыць на карысць краіны соцыялізма — гэта была яго найвышэйшая мэта і штодзенны абавязак. Не гледзячы на цяжкую хваробу, ён да самай апошняй хвіліны захаваў у сябе ясны розум і вялікае пачуццё, і апошні свой выдатны твор напісаў літаральна на смяротнай пасцелі.

Бывай навекі, друг.

Светлая памяць аб табе назаўсёды астанецца ў нашым сэрцы.

К. КРАПІВА.

Народ не забудзе твайго слаўнага імя

Памёр Эдуард...

Абарвалася прыгожае жыццё выдатнага пісьменніка, вернага сына народа, які мастацкім словам змагаўся за праўду, за перадавыя ідэі чалавецтва, за ідэі партыі Леніна—Сталіна.

У асобе Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка беларуская літаратура страціла чалавека, які ўсё сваё жыццё аддаў на служэнне народу.

Смерць вырвала з нашых радоў пісьменніка, чалавека і друга, якому не было нічога даражэй на свеце, як вялікія ідэалы чалавецтва—комунізм, як стварэнне сапраўды мастацкай літаратуры, вялікай літаратуры соцыялізма.

Ён любіў праўду і ненавідзеў хлусню. Ён захапляўся сапраўдным мастацтвам і адкідваў нягоднае і выпадковае ў літаратуры — ману і прыспасабленцтва.

Партыя і ўрад па заслугах ацанілі талент выдатнага майстра мастацкага слова, узнагародзіўшы Эдуарда Людвігавіча Самуйлёнка ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Але яму не ўдалося ўбачыць ордэн у сябе на грудзях і пакрасавацца ім.

Бывай, Эдуард...

Народ не забудзе твайго слаўнага імя.

Ілья ГУРСКІ.

БЫВАЙ, ЭДУАРД!

Не стала Эдуарда—таленавіцейшага пісьменніка, выдатнага чалавека.

Жыццё яго поўна творчых узлётаў, мужнага самаадданага служэння мастацтву соцыялізма.

Часіны, якія давялося мне правесці разам з Эдуардам, у памяці маёй і ў сэрцы маім застануцца назаўсёды.

Светлыя часы юнацтва! Ціхая, роўная плынь Цітаўкі, узмах вёсел і поўныя задумы і любві да жыцця і сяброўства вочы Эдуарда. Цяпер, калі дарагі таварыш ляжыць у гробе і мы, сябры яго, стаім вакол яго ў ганаровым карауле — цяжка ўспамінаць светлыя дні працы і дружбы.

Бывай, Эдуард! Ты займаў у нашых сэрцах пачэснае месца і будзеш жыць у іх вечна. Замяніць талент твой, працу тваю — немагчыма, але каб хоць крыху зменшыць страту, якую перажывае літаратура, кожнаму з нас трэба рабіць за дваіх.

Аркадзь КУЛЯШОУ.

ТВОРЫ ЯГО БУДУЦЬ ЖЫЦЬ НА НАШАЙ СЦЭНЕ

Памёр таленавіты пісьменнік. Не стала цікавага чалавека — разумнага, культурнага, дзейснага.

Яшчэ так нядаўна мы слухалі яго п'есу «Пагібель воўка» — выдатны, яркі, ідэйна насычаны твор. Мы палюбілі герояў гэтай п'есы: мужных пагранічнікаў, жыццёрадасных калгаснікаў. Якія цікавыя людзі! Як таленавіта напісаны яны аўтарам! З чэхаўскай маляўнічасцю абрысаваў Самуйлёнак характары дзеда Анісіма, Язэпа, Лук'яна, Рабічку і інш. Яркімі тыповымі дэталямі ўзбагаціў іх аўтар.

Калгас у гэтай п'есе прадстаў перад намі дружным, моцным, спаяным калектывам, поўным вялікага імпэту да працы, поўным вялікай нянавісці да ворагаў, поўным яркай, сонечнай любві да сваёй радзімы, да светлай комуністычнай будучыні.

За гэту п'есу, за выдатны раман «Будучыня», за таленавітыя паляўнічыя апавяданні, за шырокія думкі аўтара мы палюбілі Эдуарда Самуйлёнка. Нашы сэрцы напоўніліся вялікай радасцю, калі мы даведаліся аб высокім узнагароджанні партыяй і ўрадам нашага любімага пісьменніка. Мы былі такія шчаслівыя за яго—нам так хацелася ўбачыць яго, радаснага, з ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга на грудзях.

Бязлітасная смерць спыніла гэта дарагое жыццё.

Разам з усім народам, ведаўшым і любіўшым Эдуарда Самуйлёнка, мы смуткуем сёння над яго гробам.

Ён памёр, але памяць аб ім будзе жыць у нашых сэрцах.

Ён памёр, але творы яго будуць жыць на нашай сцэне.

Бывай, дарагі таварыш!

КАЛЕКТЫУ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАУНАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА.

Выдатны пісьменнік і драматург

Калектыў Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР разам з усёй пісьменніцкай грамадскасцю, з усімі работнікамі мастацтваў і працоўнымі рэспублікі смуткуе аб заўчаснай смерці выдатнага пісьменніка, таленавітага драматурга-ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка.

Смерць вырвала з радоў беларускай літаратуры аднаго з лепшых драматургаў нашай Совецкай Беларусі. Прадсмяротны драматургічны твор Эдуарда Самуйлёнка «Пагібель воўка» ярка сведчыць аб росквіце гэтага цудоўнага пісьменніка.

Партыя і ўрад высока ацанілі работу Эдуарда Самуйлёнка, узнагародзіўшы яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Смерць спыніла кіпучае творчае жыццё таленавітага пісьменніка, прадстаўніка надзвычайнай плеяды беларускіх пісьменнікаў, якія нядаўна ў сталіцы Совецкага Саюза так ярка прадэманстрыравалі свой рост, праслаўляючы тым самым нашу цудоўную радзіму—Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Армія работнікаў мастацтва, пісьменнікі, акторы, мастакі і музыканты на смерць выдатнага пісьменніка Эдуарда Самуйлёнка адкажуць яшчэ больш інтэнсіўнай, напружанай творчай працай.

Сустракаючы XVIII з'езд сваёй роднай большэвіцкай партыі і ў адказ на высокія ўзнагароды, атрыманыя нашымі беларускімі пісьменнікамі, мы, работнікі тэатра, з'яўляючыся адным з атрадаў вялікай арміі работнікаў літаратуры і мастацтва, яшчэ актыўней уключымся ў ганаровую справу выхавання совецкага народа ў комуністычным духу, у справу ліквідацыі астаткаў капіталізма ў свядомасці людзей. Гэтай справе да апошніх дзён свайго жыцця служыў і быў верны наш таленавіты пісьменнік-драматург Эдуард Самуйлёнак.

КАЛЕКТЫУ ДЗЯРЖАУНАГА ЯУРЭЙСКАГА ТЭАТРА БССР.

Яго творы ўвойдуць у залаты фонд беларускага мастацтва

Абарвалася жыццё выдатнага пісьменніка, надзвычайнага чалавека Эдуарда Самуйлёнка.

Гэта смерць—цяжкі ўдар, жорсткая ўтрата для беларускай літаратуры, для тэатральнага мастацтва Совецкай Беларусі. Вялікі талент Эдуарда Самуйлёнка знаходзіўся ў самым росквіце—колькі выдатных твораў змог-бы яшчэ даць ён нашаму народу. Вялікае творчае жыццё чакала яго; толькі за некалькі дзён да трагічнага фінала ён быў узнагароджан совецкім урадам ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга; народ наш ведаў, цаніў, любіў пісьменніка і драматурга Эдуарда Самуйлёнка.

Эдуард Самуйлёнак мужна і гераічна змагаўся з хваробай—вялікая сіла творчасці, якая жыла ў ім, была мацней самай страшэннай хваробы. Ужо будучы хворым, ён напісаў два такія выдатныя творы, як раман «Будучыня» і п'еса «Пагібель воўка», якая рыхтуецца зараз да пастаноўкі ў многіх тэатрах нашай рэспублікі.

Жыццё і творчасць пісьменніка Эдуарда Самуйлёнка—узор самаахвярнага, таленавітага служэння свайму народу.

Памяць аб ім будзе доўга жыць у нашых сэрцах. Яго творы ўвойдуць у залаты фонд літаратуры і мастацтва Совецкай Беларусі.

Бывай, родны незабыўны таварыш!

ОЗІРСКІ, ЮДЭЛЕВІЧ, ВЛАДАМІРСКІ, АЛЕКСАНДРОУСКАЯ, МІРОВІЧ, ГАНТМАН, АЛЕР, ЛІБЕРЗОН, СЯРГЕЕУ.

Глыбока смуткуем

Глыбока смуткуем з прычыны цяжкай для нас усіх смерці пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка. Малады, поўны творчых сіл, ён заўчасна і так нечакана памёр. Зараз ва ўсёй паўнаце ўстае яго мілы, родны вобраз таленавітага пісьменніка, чулага, адданага таварыша, які яшчэ так нядаўна знаходзіўся з намі. Але мы хаваем толькі тваё цела, Эдуард; тваеж словы, мыслі заўсёды будуць жыць і гаварыць аб табе—патрыёту нашай вялікай радзімы, выдатным аўтару «Будучыні», «Пагібелі воўка», «Сержанта Дроба». Гэтыя творы будуць здабыткам нашай совецкай літаратуры.

Бывай, дарагі таварыш! Твае сур'ёзныя, волевыя адносіны да жыцця і твая таленавітая творчасць будуць для нас прыкладам таго, як жыць, тварыць і працаваць для нашай шчаслівай радзімы.

ДЗЯНІСАУ, ШЧЭГЛОУ, ПРАГІН.

ВЫДАТНЫ ТАЛЕНТ

Вестка аб смерці Эдуарда Самуйлёнка глыбока ўсхвалявала мяне.

Яшчэ нядаўна я слухаў яго займальныя апавяданні аб прычудах рыбнай лоўлі. Нават у гэтых невялікіх вусных апавяданнях адчуваўся пісьменнік вялікіх дараванняў. Яго жыццёрадаснасць і аптымізм выклікалі захапленне.

Цяжка ўявіць, што ў росквіце творчых сіл памёр выдатны пісьменнік.

І. А. ПАШКЕВІЧ.

ПАМЯЦІ ЛЕПШАГА ДРУГА

Зімой 1932 года, будучы з тэатрам у Полацку, я пазнаёміўся з Эдуардам Самуйлёнкам. Ён прачытаў мне сваю аповесць «Тэорыя Каленбрун». Аповесць выкрывала метады фашысцкай разведкі сумежнай дзяржавы ў барацьбе з Совецкім Саюзам, метады перакідкі шпіёнаў-дыверсантаў. Аповесць малявала і гераічную барацьбу комуністычнай партыі сумежнай дзяржавы за абарону Совецкага Саюза— радзімы ўсіх працоўных. Я, як рэжысёр, быў захоплен навізной тэмы, стройнасцю цікавага сюжэта, драматычнай напружанасцю падзей. Я тут-жа пачаў угаварваць Эдуарда напісаць паводле аповесці п'есу для тэатра. Думка яму спадабалася, але, спасылаючыся на няведанне сцэнічных законаў, ён адцягваў пачатак работы. Я з свайго боку настойваў, абяцаючы дапамогу ў якасці рэжысёра. Так пачалася творчая і асабістая дружба з Эдуардам. Эдуард быў чалавекам вялікай страснасці і надзвычайнай прынцыповасці. У рабоце над п'есай ён настойліва, з вялікім творчым запалам таленавітага чалавека, хутка авалодваў драматургічнай тэхнікай.

Вясной 1935 года была закончана п'еса «Сержант Дроб». Але многа пакут прышлося перанесці Эдуарду Самуйлёнку, перш чым «Сержант Дроб» убачыў сцэну. Ворагі народа, якіх гэта п'еса выкрывала, імкнуліся ўсімі сіламі сарваць пастаноўку п'есы ў тэатры. Былі ўжыты ўсе сродкі — паклёп, застрашванні, абвінавачанні ў схематызме, пагромныя рэцэнзіі на п'есу і, нарэшце, забарона пастаноўкі Галоўрэперткомам. Але вера ў тое, што п'еса робіць карысную справу для нашай радзімы, вялікая настойлівасць і дапамога чэсных комуністаў выратавалі становішча. Над п'есай пачалі працаваць без афіцыйнага дазволу Галоўрэперткома і яна ў снежні 1935 года вышла ў Гомельскім тэатры ў маёй пастаноўцы.

Помню радасную ўсхваляванасць Эдуарда, калі глядач бурна рэагіраваў на падзеі ў п'есе. Яна прайшла ў Гомелі падрад каля 40 разоў. Калгаснікі спецыяльнымі эшалонамі прыязджалі глядзець п'есу. Масавыя выступленні рабочых у друку высока ацэньвалі п'есу. Гомельскі партыйны актыў на дыспуце, дзе прысутнічала каля 500 чалавек, даў надзвычай высокую ацэнку п'есе: яе партыйнасці, надзвычайнай карыснасці і вялікай мастацкай якасці.

Ва ўсіх гарадах Беларусі, дзе тэатр паказваў п'есу «Сержант Дроб», яна заўсёды рабіла вялікае ўражанне на гледача, заўсёды атрымлівала надзвычай высокія ацэнкі.

Наступным творчым замыслам Эдуарда ў галіне драматургіі была п'еса-сатыра, выкрываючая дзейнасць беларускіх нацдэмаў, пад назвай «Курачая рэспубліка». Эдуард дзяліўся планамі п'есы, ярка акрэсліваў вобразы. П'есу думаў закончыць у канцы 1936 года. Але высмеяны ворагам народа, прабраўшымся на пост культпропа ЦК КП(б)Б, які адхіліў творчую заяўку Самуйлёнка, Эдуард пакінуў працу над гэтай п'есай.

Пасля скончэння рамана «Будучыня», трохі зморaны, але радасны ад скончанай працы, Эдуард ужо задумляў п'есу «Пагібель воўка». Не гледзячы на лёгкае занядужанне, ён з вялікім творчым хваляваннем абмяркоўваў сюжэтную канву і вобразы новай п'есы. Увесну 1938 года, будучы ў Крыме, ён ужо напісаў першы сцэнарый п'есы, якую і скончыў 21 лістапада 1938 года. У часе працы над гэтай п'есай я Эдуарда бачыў бязмежна любячым сваю радзіму патрыётам, адданым справе Леніна—Сталіна беспартыйным большэвіком, які марыў як найхутчэй уліцца ў рады комуністычнай партыі, чалавекам, любячым свой совецкі народ і страсна ненавідзячым ворагаў.

Канчаючы п'есу, Эдуард ужо марыў аб напісанні лёгкай, радаснай камедыі, прысвечанай моладзі нашай радзімы, але хвароба абарвала жыццё гэтага цудоўнага чалавека і адданага друга. Ён памёр у пару самага росквіту свайго незвычайнага таленту.

Спі, дарагі друг! Ты будзеш жыць у сваіх творах.

Я, як пастаноўшчык п'есы «Пагібель воўка», абяцаю аддаць усе свае веды, здольнасці і сілы, каб у спектаклі максімальна ярка гучалі твае думкі, пачуцці, твая нянавісць да ворагаў, твая гарачая любоў да радзімы, твая бязмежная адданасць партыі і вялікая любоў да правадыра працоўных усяго свету вялікага Сталіна.

К. САННІКАУ.
Рэжысёр Белдзяржтэатра.

СТРАСНЫ ПІСЬМЕННІК

Памёр выдатны, таленавіты пісьменнік Эдуард Самуйлёнак. Не хочацца верыць, што смерць вырвала ў нас пісьменніка вялікага размаху, выдатнага мастака літаратуры. Творчасць Эдуарда Самуйлёнка займае ганаровае месца ў беларускай літаратуры і карыстаецца вялікай увагай і любоўю чытача. Працавіты, патрабавальны да сябе, будучы ўжо хворы, ён не спыняў сваёй творчай работы, не гледзячы на ўгаворы таварышоў. Зусім нядаўна ён марыў аб паездцы ў сонечную Грузію, у новую Калхіду для работы над другой часткай рамана «Будучыня». Яшчэ зусім нядаўна ён пісаў нам з санаторыя ў адказ на наша віншаванне ў сувязі з узнагароджаннем яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, што ён выканае свае абавязкі перад радзімай, што ён гарыць імкненнем да гарачай творчай працы. Такі ўвесь Самуйлёнак: страсны пісьменнік, непартыйны бальшавік.

Калектыў супрацоўнікаў Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі разам з усёй совецкай грамадскасцю перажывае гэтую вялікую ўтрату для беларускай літаратуры.

М. РЭПІНСКІ, Т. ГАРБУНОУ, М. ДОСІН, П. ПАДБЯРЭЗСКІ, З. ЦЫРЛІН, Х. СТОЛІН, Х. АЛЕКСАНДРОВІЧ, Р. БЛЯХ, І. КРАУЛЬЕУ, М. ВОЛГІНА.

Таленавіты майстар

У асобе Эдуарда Самуйлёнка беларуская совецкая літаратура страціла аднаго з сваіх самых таленавітых майстроў. Яго незабыўныя творы «Тэорыя Каленбрун», «Будучыня», «Пагібель воўка» сведчаць аб непарыўнай сувязі пісьменніка з народам, аб вялікіх мастацкіх здольнасцях Эдуарда Самуйлёнка.

Светлы воблік пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка не забудуць ні тыя, хто ведаў яго асабіста, ні тыя, хто чытаў і чытае яго выдатныя творы.

БАРЫСЕНКА, МАСЛОУСКІ, ЛАРЧАНКА, ФІГЛОУСКАЯ, ДВОРКІНА.

Вялікая ўтрата

Смерць выдатнага пісьменніка Эдуарда Самуйлёнка павяргае нас у глыбокі смутак.

Эдуард Самуйлёнак вырван смерцю з радоў беларускіх пісьменнікаў у росквіце сваіх творчых сіл, калі перад ім адкрыліся неабсяжныя магчымасці для плённай творчасці. У нашу вялікую Сталінскую эпоху работа ў галіне культуры, мастацтва набывае з кожным днём усё большае і большае значэнне.

Утрата таленавіцейшага пісьменніка — цяжкая ўтрата. Мы падзяляем агульны смутак і выказваем глыбокае спачуванне Саюзу совецкіх пісьменнікаў БССР, сям'і нябожчыка і ўсім яго сябрам.

З. І. АЗГУР, А. О. БЕМБЕЛЬ, А. В. ГРУБЭ, М. А. КЕРЗІН, В. В. ВОЛКАУ.

Выдатнае жыццё чалавека

Гэта было ў 1930 годзе. Я сустрэўся з Эдуардам Самуйлёнкам у Полацку. Як цяпер памятаю гэтага здаровага, маладога, моцнага чалавека. Мне часта прыходзілася сустракацца з ім у рэдакцыі газеты, дзе ён тады працаваў сакратаром. Хто ведаў блізка Эдуарда, той, вядома, з яшчэ большай горыччу канстатыруе гэту недарэчную смерць, якая так рана абарвала такое патрэбнае жыццё.

Яшчэ зусім нядаўна Эдуард у захапляючай гутарцы дзяліўся сваімі планамі. У гэтым чалавеку здзіўляла сіла назіральнасці.

Эдуард Самуйлёнак заслужана заняў ганаровае месца ў беларускай совецкай літаратуры. Партыя і ўрад высока ацанілі работу таленавітага пісьменніка і ўзнагародзілі яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Выдатнае жыццё чалавека — пісьменніка надоўга застанецца ў памяці.

Барыс МАЛКІН.

Памяці пісьменніка-ордэнаносца

Памёр пісьменнік-ордэнаносец Эдуард Самуйлёнак.

Няўмольная смерць вырвала з сям'і совецкіх пісьменнікаў аднаго з таленавіцейшых маладых беларускіх літаратараў, выхаваных большэвіцкай партыяй.

Эдуард Самуйлёнак памёр у самым росквіце свайго літаратурнага даравання. За невялікі перыяд сваёй літаратурнай дзейнасці ён унёс у скарбніцу беларускай совецкай літаратуры рад высокамастацкіх твораў, пачынаючы з «Тэорыі Каленбрун» і канчаючы першай кнігай рамана «Будучыня» і п'есай «Пагібель воўка», у якіх талент Эдуарда Самуйлёнка раскрыўся ва ўсёй сваёй сіле.

У сваіх творах Самуйлёнак стварыў рад яркіх, запамінаючыхся мастацкіх вобразаў совецкіх людзей. Яго апошні, нажаль, незакончаны раман з'яўляецца цудоўнай песняй, якую праспяваў Эдуард Самуйлёнак аб братняй совецкай рэспубліцы—сонечнай Грузіі.

Просты, скромны, працалюбівы, патрабавальны да сябе, Эдуард Самуйлёнак аддаў усе свае сілы на службу совецкаму народу і соцыялістычнай радзіме.

Працоўныя Совецкай Беларусі ніколі не забудуць светлага вобраза свайго любімага пісьменніка, аддаўшага ўсяго сябе для росквіту беларускай літаратуры і культуры. Гэту благародную рысу характару Самуйлёнка павінен выхоўваць у сабе кожны совецкі пісьменнік.

Самуйлёнка, не стала. Але гэту цяжкую для беларускай літаратуры ўтрату заменяць новыя кадры маладых літаратараў, якімі так багат совецкі народ.

Студэнты КІЖ'а БССР імя С. М. Кірава:
П. РУНЕЦ, А. ДРОЗД.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск. друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Уп. Галоўлітбела № К—849.